329.15(476)
Ч-20

# Аляксандр Чарвякоў:

# ...Я ніколі не быў ворагам

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Выбраныя артыкулы і прамовы

Успаміны сучаснікаў

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

329.15(476)
Ч-20

# Аляксандр Чарвякоў: ...Я ніколі не быў ворагам

*Выбраныя артыкулы і прамовы*

*Успаміны сучаснікаў*

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
286805
Ч/З
М
Президентская библиотека Республики Беларусь
8 800000 159331

Мінск
«Беларусь»
1992

ББК 66.61(2)2
Ч-20

Складальнік В. Ц. МЫСЛІВЕЦ

Выпушчана па дзяржаўнаму заказу.

Калектыў выдавецтва "Беларусь" накіраваў са свайго прыбытку 91 тыс. руб. для кампенсацыі страт ад выдання кнігі. З дзяржбюджэту выдаткавана на выданне 41 тыс. руб.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Это издание подготовлено к 100-летию со дня рождения А. Г. Червякова, одного из организаторов и руководителей Белорусской ССР, видного государственного деятеля.

В книгу вошли наиболее значимые публицистические работы А. Г. Червякова, а также воспоминания людей, хорошо знавших его.

Ч $\frac{0503020000 - 062}{М\ 301(03) - 92}$ 08 — 92

ISBN 5-338-00932-3

© Складанне.
В. Ц. Мысліевец, 1992

# Усебеларускі стараста

Сярод тых волатаў думкі і духу, якія стаялі каля вытокаў утварэння Беларускай рэспублікі і вызначэння статусу яе дзяржаўнасці, адно з першых месц, безумоўна, належыць слаўнаму сыну зямлі нашай, вядомаму дзяржаўнаму дзеячу Аляксандру Рыгоравічу Чарвякову. Яго любоў да роднага краю — гэта любоў пакутніка і патрыёта, які адстойваў права беларускага народа «людзьмі звацца» і змагаўся за яго.

Нарадзіўся А.Р. Чарвякоў у вёсцы Дукарка на Пухаўшчыне сто гадоў назад. Край гэты песенны, мужны. Землякі будучага дзяржаўнага дзеяча ў сярэдзіне мінулага стагоддзя здзейснілі народны прысуд і ўтапілі ў Свіслачы злога памешчыка Ашторпа. Яны ваявалі ў атрадах паўстанцаў Кастуся Каліноўскага. А ў 1905 г. выйшлі на барыкады першай рускай рэвалюцыі. Сям'я Чарвяковых жыла даволі бедна, але бацька ўмеў чытаць і пісаць, з малых гадоў вучыў грамаце сваіх дзяцей. У пошуках заробкаў ён часта пераязджаў з маёнтка ў маёнтак, з воласці ў воласць былога Ігуменскага павета, нарэшце трапіў у Вільню і ўладкаваўся пісарам у ваенна-інжынерную дыстанцыю на чыгунцы. Перавёз туды і сям'ю. Аднак родная Дукарка на ўсё жыццё наталіла Аляксандра Рыгоравіча паэзіяй народных свят і горкай суровасцю сялянскіх будняў.

У Вільні Аляксандр змог экстэрнам здаць экзамены на званне народнага настаўніка і паехаў у Трокскі павет вучыць дзяцей літоўскіх сялян. Царская праграма патрабавала весці навучанне толькі на рускай мове. Але малады настаўнік адразу адчуў непаразуменне аўдыторыі і пачаў вывучаць літоўскую і польскую мовы, стаў сваім, паважаным чалавекам у вёсцы. Асабліва любілі літоўцы беларускія песні ў выкананні настаўніка, якіх Аляксандр Рыгоравіч ведаў многа. Народнае жыццё — вось крыніца, якая для А.Р. Чарвякова ніколі і нідзе не перасыхала. Іменна цесная сувязь з народам забяспечыла яму ўсебаковае развіццё.

Вялікую адказнасць браў на сябе А. Чарвякоў, калі вучыў літоўскіх дзяцей на іх роднай мове. Жандары занеслі яго

прозвішча ў спісы палітычна ненадзейных. Аднак настаўнік не хацеў пагаджацца з уладамі, што літоўскай мовы няма, як тое сцвярджала інструкцыя міністэрства народнай адукацыі Расійскай імперыі. Літоўцы гавораць на роднай сваёй мове. Школа, як грамадская ўстанова, павінна працаваць на мове бацькоў, якая толькі і зразумела дзецям, спрыяе іх развіццю. Пазней Аляксандр Рыгоравіч скажа больш рашуча і катэгарычна: «Не народ для ўстановы, а ўстанова для народа. Установа павінна гаварыць на той мове, на якой гаворыць народ». І сам ён быў верны гэтаму прынцыпу. Крылаты выраз А. Чарвякова асабліва надзённы і цяпер, калі абудзілася нацыянальная свядомасць, якая і можа прывесці да актыўнага дзеяння ўсе народы.

Аднак у 1912 г. жандары і чыноўнікі выжылі А. Чарвякова са школы. Неўзабаве А. Чарвякоў паступіў у Віленскі настаўніцкі інстытут. Там прагна чытаў класіку, вывучаў рускі рэвалюцыйны рух, творы сацыял-дэмакратаў. У канцы навучання педагагічны савет інстытута зазначыў: «Здольны і талковы, але захапляецца чытаннем падазроных газет».

У самы разгар першай сусветнай вайны А. Чарвякова прызвалі на службу ў царскую армію. Па шчаслівай выпадковасці не кінулі на фронт. Як адукаванага чалавека і добрага салдата, яго накіравалі ў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча. Тут многія навучэнцы і афіцэры шукалі ў жыцці самых важных ісцін, шукалі гармоніі ў рэвалюцыі, дыханне якой апаляла душы.

Летам 1916 г. у чыне прапаршчыка А. Чарвякова накіравалі ў Іркуцк, у запасны полк. Заўсёды ўдумлівы, ён да ўсяго пільна прыглядаўся, стараючыся зразумець сэнс таго, што адбывалася ў царскай арміі. Асаблівую ўвагу праяўляў да афіцэраў. Па-рознаму адносіліся яны да падзей на фронце. Адны верай і праўдай служылі цару, паражэнне рускай арміі ў баях з кайзераўцамі лічылі часовай з'явай, рваліся абараняць «цара і айчыну». Шмат было і такіх камандзіраў, якія бавілі дзень да вечара, прапівалі розум і сумленне, слухаць не хацелі клёкату класавых бітваў, якія наспявалі. Настрояў ні першых, ні другіх А.Чарвякоў не падзяляў. А зблізіўся з афіцэрамі, якім бачыўся ўжо світанак новай эпохі. Яны наведвалі сходы ў гарадской дзіцячай бібліятэцы, чыталі газеты, горача абмяркоўвалі становішча на фронце, гаварылі пра палітыку, знаёміліся з бальшавікамі. Так у Аляксандра Рыгоравіча назапашваўся жыццёвы вопыт, паглыблялася пазнанне народнай душы, народных характараў, выспявала думка аб неабходнасці барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае разняволенне працоўнага народа.

Думкі такія суправаджалі А.Чарвякова ў лютым 1917 г., калі яго адкамандзіравалі ў Петраград. Аляксандр Рыгоравіч прымаў

удзел у Лютаўскай рэвалюцыі, у маі ўступіў у бальшавіцкую партыю. У час ліпеньскіх падзей вывеў на вуліцы горада сваю кулямётную роту, самаахвярна, свядома вёў барацьбу за справу рэвалюцыі. У кастрычніцкія дні кулямётчыкі Чарвякова разам з камандзірам бралі штурмам Зімні, смела адбівалі атакі юнкераў і казакоў.

У жыцці А.Чарвякова пачаўся новы этап, ён быў прызначаны адказным за лёс мільёнаў беларускіх бежанцаў, якія трэслі сваімі жабрацкімі торбамі па ўсёй Расіі. З уласцівай яму энергіяй Аляксандр Рыгоравіч стварыў беларускія нацыянальныя арганізацыі, самай моцнай і ўплывовай сярод якіх была петраградская. Ён бываў на заводах і фабрыках, агітаваў землякоў уступаць у атрады змагароў за перамогу новай улады. Пры яго непасрэдным удзеле былі створаны з добраахвотнікаў-беларусаў часці рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі. Усё жыццё А. Чарвякоў захоўваў здаровае пачуццё нацыянальнай свядомасці, сыноўскага гонару за свой народ. Клапатліва ўглядаўся ён у мінулае і сённяшняе роднага краю. Пастаянна вабілі яго народнае жыццё, мілагучная беларуская гаворка. Зусім невыпадкова Аляксандр Рыгоравіч узначаліў Беларускі нацыянальны камісарыят, утвораны ў пачатку 1918 года. Трэба сказаць, што практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання, асабліва нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва, у першыя гады Савецкай улады сустракала шмат цяжкасцей. Выключна вялікую небяспеку мела недаацэнка нацыянальнага пытання, якая звычайна апраўдвалася неабходнасцю пралетарскага адзінства працоўных усіх нацый.

Гэтыя цяжкасці надзвычай востра адчуваліся ў Беларусі, і пераадольваць іх павінен быў А. Чарвякоў. Не проста было вырашаць гэтыя пытанні ва ўмовах неверагодных гаспадарчых цяжкасцей, голаду і эпідэмій, іншаземнай інтэрвенцыі, калі жыццё выстаўляла на парадак дня дзесяткі складаных праблем, знайсці адразу правільныя шляхі і канкрэтныя формы вырашэння нацыянальнага пытання. Аднак на першых жа пасяджэннях Беларускага нацыянальнага камісарыята Аляксандр Рыгоравіч прапанаваў падрыхтаваць і выдаць падручнікі на беларускай мове, а таксама адкрыць Беларускі універсітэт, пачаць выданне газеты «Дзянніца». Сумленнасць, прыстойнасць, мужнасць, маральная чысціня, інтэлігентнасць, любоў да ўсяго роднага былі вызначальныя ў яго характары.

Не спалохала А.Чарвякова і прызначэнне камісарам у дывізію, якая ваявала на Паўднёвым фронце. Аднак поезд, у якім ён ехаў, трапіў у катастрофу. Аляксандр Рыгоравіч быў паранены, на доўгія месяцы адарваўся ад актыўнай дзейнасці, хоць і ў шпіталі жыва цікавіўся ўсімі падзеямі, фактычна кіраваў Белнацкомам. Пасля выздараўлення ён вёў культурна-

асветніцкую работу ў арміі. Восенню 1918 года быў накіраваны ў эшалоны сібіракоў і ўральцаў, якія змагаліся з атрадамі вядомага чэхаславацкага корпуса. Але Аляксандр Рыгоравіч жыў думкамі пра Беларусь, якую захапілі кайзераўцы. Ды ў Германіі адбылася рэвалюцыя. Савецкі ўрад ануляваў Брэсцкі дагавор. Чырвоная Армія пры падтрымцы партызан пайшла ў наступленне, ачысціла беларускі край ад акупантаў.

Разгарнулася вялікая работа па стварэнню Беларускай рэспублікі. У падрыхтоўцы асноўных партыйных дакументаў разам з Жылуновічам, Лагуном, многімі іншымі дзеячамі самы непасрэдны ўдзел прымаў і А.Р. Чарвякоў. У першым урадзе маладой Беларускай рэспублікі ён узначаліў Камісарыят народнай асветы. У лютым 1919 г. на I з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў Беларусі ў Мінску А. Чарвякова выбралі членам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Літ.-Бел. ССР, прызначылі намеснікам народнага камісара асветы. Адразу ж ён піша зварот: «Камісарыят заклікае на дапамогу ўсе культурныя сілы, усе групы, усе арганізацыі, для якіх дарагія інтарэсы працоўнага народа. Скіньце з сябе спячку, адгукніцеся на прызыўны заклік і цалкам аддайцеся вялікай асветніцкай рабоце, каб магутным парывам выгнаць цемру невуцтва».

Пасля вызвалення Беларусі ад белапольскіх захопнікаў уладу ўзяў у свае рукі Мінскі губернскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт на чале з А. Чарвяковым. Пад яго кіраўніцтвам разгарнулася шырокая работа па аднаўленню Савецкай улады, беларускай савецкай дзяржаўнасці. Гэта быў, можа, самы цяжкі і адказны перыяд у жыцці маладой рэспублікі. Сельская гаспадарка давала палавіну даваеннай прадукцыі. Прамысловасць была ў развале. Не хапала хлеба, мяса, солі, прадметаў першай неабходнасці. Расло незадаволенне сваім становішчам рабочых і сялян. І толькі талент А. Чарвякова і іншых кіраўнікоў узнімаў людзей і іх упэўненасць на лепшую долю. Аляксандр Рыгоравіч часта выступаў у гарадах і вёсках, арганізоўваў школы, курсы па ліквідацыі непісьменнасці, клубы, хаты-чытальні, бібліятэкі. Можна без перабольшання сказаць, што народ Беларусі ў асобе А. Чарвякова меў свайго чулага, пранікнёнага, разумнага кіраўніка. Яго цікавіла не паверхня жыццёвых з'яў, а іх народная, філасофская сутнасць. За гэта яго паважалі і высока цанілі як простыя людзі, так і многія дзяржаўныя дзеячы краіны і рэспублікі, з якімі зводзіў яго лёс. Незвычайная абаяльнасць, добразычлівасць, памяркоўнасць Аляксандра Рыгоравіча асабліва падабаліся простым людзям. У яго прысутнасці яны адчувалі сябе лёгка, свабодна. Заўсёды ўдавочнымі былі яго тактоўнасць і высокая ўнутраная культура. Пры любых абставінах А. Чарвякоў ніколі не траціў пачуцця ўласнай

годнасці, заўсёды заставаўся самім сабою — простым, адкрытым і шчырым.

Не памыліліся дэлегаты II Усебеларускага з'езда Саветаў, калі ў снежні 1920 г. выбралі А. Чарвякова старшынёю ЦВК Беларускай ССР, і народ шаноўна назваў яго ўсебеларускім старастам. У тыя дні газета «Звязда» пісала: «На чале толькі што выбранага ЦВК і Саўнаркома стаіць тав. Чарвякоў — старшыня Ваенрэўкома. Тав. Чарвякоў ездзіў у якасці прадстаўніка Ваенрэўкома на мірныя перагаворы, дзе вырашалася пытанне аб заключэнні міру з Польшчай. Натуральна, што яму даручана кіраўніцтва Камісарыятам замежных спраў. Напярэдадні з'езда Саветаў тав. Чарвякоў быў старшынёю на Мінскім павятовым з'ездзе Саветаў, дзе яму давялося працаваць у гушчыні сялянства і дзе ён здолеў дакладна і ўважліва падысці да пытанняў, якія хвалююць беларускую вёску. Такім чынам, тав. Чарвякоў на пасадзе старшыні ЦВК і Саўнаркома аб'ядноўвае ў сваёй асобе і кіраўніка нашай палітыкі, і сапраўднага сябра інтарэсаў працоўнага народа Беларусі». Бадай, адным з першых кіраўнікоў рэспублікі ён адчуў, якой цяжкай працай пакаленняў у надзвычай складаных умовах ствараліся духоўныя набыткі беларускага народа, адным з першых заклікаў зберагаць помнікі архітэктуры, гісторыі і культуры.

Ён сябраваў з многімі беларускімі пісьменнікамі.

Доўгае сяброўства звязвала А. Чарвякова з народным песняром Янкам Купалам. Гасцямі старшыні ЦВК былі Кузьма Чорны і Максім Лужанін. Сам ён быў аўтарам многіх артыкулаў, якія друкаваліся ў газетах і часопісах. З вялікай увагай адносіўся А. Чарвякоў да творчасці сваіх землякоў. А імі былі Васіль Гарбацэвіч — аўтар першай беларускай п'есы паслякастрычніцкай пары «Чырвоныя кветкі Беларусі» і Міхась Чарот — пачынальнік савецкага перыяду ў розных жанрах літаратуры і мастацтва. Дарэчы, апошні суправаджаў А. Чарвякова ў многіх паездках па рэспубліцы, напісаў нарыс «1200 вёрст па Беларусі».

У пачатку 1926 г. грамадскасць рэспублікі адзначала пяцігоддзе работы А. Чарвякова на пасадзе Старшыні Прэзідыума ЦВК БССР. Юбіляр атрымаў мноства пісьмаў і тэлеграм ад калектываў працоўных. Высока ацаніў яго дзейнасць Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР. У віншаванні гаварылася: «Пад вашым непасрэдным кіраўніцтвам Беларусь, занядбаная краіна пры царскім рэжыме, стала палітычным і культурным цэнтрам усіх беларусаў...» Усцешыла Аляксандра Рыгоравіча само слова «краіна». Цешыў ён гэтым выразам і сваіх шматлікіх сяброў — вучоных, пісьменнікаў, землякоў.

З пачаткам індустрыялізацыі краіны А.Чарвякоў часта наведваў важнейшыя новабудоўлі рэспублікі. Выступаў,палымяным

словам абуджаў высокія пачуцці любові да роднай бацькаўшчыны, натхняў на працоўныя подзвігі. «Праўда, нам цяжка і яшчэ неаднойчы будзе цяжка, — гаварыў Аляксандр Рыгоравіч рабочым «Асінторфа», — але мы не адзінокія — з намі ўся краіна... Мы ўсе цяжкасці пераадолеем».

Самааддана і самаахвярна стараўся А. Чарвякоў палепшыць жыццё, побыт свайго народа. Пастаянным клопатам яго было сялянства, будучыня якога вызначалася словамі «цывілізаваныя кааператары». Бачыў Аляксандр Рыгоравіч, як цесна, па 3 — 4 сям'і на адным двары, жылі людзі ў яго родных мясцінах, шмат дзе па Беларусі. Як радаваўся ён рассяленню вёсак на пасёлкі з вялікімі агародамі і садамі, усяляк падтрымліваў рэабілітаваную цяпер «прышчэпаўшчыну».

Няпростымі былі для Чарвякова гады разбурэння старой вёскі і нараджэння новай. Іменна такая роля адводзілася калгасам. Новыя рытмы як бы прыглушалі адвечную музыку поля і гоман беларускіх гаёў і пушчаў. Аляксандр Рыгоравіч тым не менш праводзіў, а магчыма, вымушаны быў праводзіць, курс на калектывізацыю.

Два тыдні правёў Аляксандр Рыгоравіч у Смілавіцкім раёне, і там амаль 80 працэнтаў сялян уступіла ў калгасы. Усё гэта так. Але колькі «хадакоў» пабывала ва ўсебеларускага старасты за тыя гады масавых высылак і рэпрэсій! Амаль кожны трэці зямляк! Даводзілася яму заклікаць людзей да цярплівасці і паслухмянасці, спачуваць ім, абяцаць разабрацца, аблегчыць долю. І ў той жа час пісаць артыкул «За суцэльную калектывізацыю і за ліквідацыю кулацтва як класа».

Цяжкімі былі апошнія гады жыцця А. Чарвякова. Дубінка так званай «нацдэмаўшчыны» вынішчала лепшых сыноў рэспублікі. Адны з іх пайшлі сібірскімі трактамі, іншыя кладліся снапамі ў брацкія магілы на месцы. Без згоды А. Чарвякова і нават насуперак яго волі змяніўся беларускі правапіс. Пашыраўся спіс забароненых для чытання кніг, у які трапіла нават «Новая зямля» Я. Коласа. Ніякіх змен да лепшага не паабяцаў яму М.І. Калінін, які ў ліпені 1935 г. наведаў Беларусь і ўручыў рэспубліцы ордэн Леніна. Перагаворы на возеры адзін на адзін нават пагоршылі самаадчуванне Аляксандра Рыгоравіча.

Усё гэта неміnуча набліжала трагічны дзень 16 чэрвеня 1937 г., калі жыццё А. Чарвякова абарвалася. Як заўсёды, і яго заўчасная смерць пакінула многа загадак: скончыў самагубствам ці застрэлілі сталінскія каты? Апошнюю версію актыўна падтрымлівае і прапагандуе кандыдат гістарычных навук У. Якутаў.

Мог, зразумела, і Сталін паўплываць на лёс «беларускага нацыяналіста» А. Чарвякова, як тады гаварылі. Але паспрабуем

прасачыць ход падзей апошняга дня жыцця старшыні ЦВК. Адбываўся XYI з'езд Кампартыі Беларусі. У час выступлення А. Чарвякова з залы сыпаліся бязглуздыя рэплікі, правакацыйныя пытанні, лямант і свіст. У пратаколе зафіксавана звыш ста перапынкаў. Але выдатны прамоўца не сышоў з трыбуны. Дык якое пасля гэтага магло быць у яго самаадчуванне? Столькі папрацаваў на рэспубліку і народ — і такая публічная знявага!

У ліку такіх нядобразычліўцаў быў і тагачасны партыйны лідэр В.Ф. Шаранговіч. Першы закід Васіля Фаміча на ўсебеларускага старасту: «Таварышы, у святле ўскрытых фактаў контррэвалюцыйнай, здрадніцкай ролі БКА, нацдэмаў, правых, якую яны адыгрывалі на ўсім працягу часу ў нас, у Беларусі, у святле апошніх іх спраў не дрэнна будзе, калі Чарвякоў, які з усімі імі салідарызаваўся і падтрымліваў (хоць ён ужо і крытыкаваў сябе за гэтыя свае памылкі), раскажа нам на XYI з'ездзе, як ён глядзіць на ўсё гэта зараз». Ворагамі народа дакладчык называў многіх выдатных дзеячаў нашай рэспублікі. Аляксандр Рыгоравіч абвінавачваўся ў сяброўстве з імі. Нават пасля таго, як з Чарвяковым здарылася непапраўнае, В. Шаранговіч не зліТаваўся над нябожчыкам, яго роднымі і сябрамі. У заключным слове ён назваў усебеларускага старасту двурушнікам. І далей:

«Мы ўсе ведаем, як Чарвякоў на ўсім працягу барацьбы КП/б/Б супраць яго памылак ніколі не быў шчырым у сваіх адказах перад партыяй. Ён заўсёды двурушнічаў. Ён заўсёды манеўраваў з адвакацкімі ўлоўкамі і выкрутамі. Мне і многім з нас даволі часта даводзілася крытыкаваць Чарвякова, і ніколі мы не сустракалі з яго боку шчырасці ў адказах на гэтую крытыку. Хто не ведаў Чарвякова, які яшчэ ў былыя часы на з'ездах партыі ўмеў гаварыць і ўмеў граміць тых людзей, якія выступалі супраць яго і ўскрывалі яго памылкі».

Крыху перадыхнём! Скажам адно: завельмі перапала А. Чарвякову за славутую «прышчэпаўшчыну», якой сёння можам і ганарыцца!

Прамоўца В. Шаранговіча працягваў:

«Таварышы, вазьміце тое, што ён тут гаварыў аб Галадзеду... Чалавек бачыць, што Галадзеда на з'ездзе выкрываюць як правага на канкрэтных матэрыялах; Чарвякоў жа ўхітрыўся, гаворачы аб Галадзеду, пабудаваць сваю прамову на асабістых адносінах з Галадзедам, не крытыкаваў яго палітычна, не выкрываў правыя справы Галадзеда.

Каму не вядома, што Чарвякоў з Галадзедам разам насаджалі прышчэпаўшчыну; каму не вядома, што яны ўсе дакументы апрабіравалі, будучы ля ўлады, багатварылі Прышчэпава. А хіба ўсе правыя справы Галадзеда Чарвякову не вядомы лепш, чым каму? Яму вядомы лепш...

Таварышы, ва ўсякім выпадку я абсалютна ўпэўнены, што і наш з'езд, і ўся наша КП/б/Б, і ўвесь народ Беларусі сустрэнуць, ацэняць паведамленне аб самагубстве Чарвякова як яго варожы акт, акт супраць партыі, супраць Савецкай улады, супраць народа, супраць усіх нас.

Галасы: — Правільна».

Аляксандр Рыгоравіч заключнага слова В. Шаранговіча ўжо не чуў. А калі б быў жывы і пачуў думкі кіраўніка рэспубліканскай партыйнай арганізацыі, дык бы, несумненна, зрабіў тое, што зрабіў напярэдадні, паслухаўшы грубыя, беспадстаўныя абвінавачванні сваіх нядаўніх сяброў-таварышаў. Ну, першае: напісаў бы абавязкова пасмяротнае пісьмо-зварот да сваіх людзей, якое і напісаў-такі перад самагубствам:

«Я выступіў на з'ездзе сумленна і адкрыта. Нічога я не хаваў, бо ў мяне няма чаго хаваць. Нікога ніколі я не арганізоўваў супраць партыі, супраць Савецкай дзяржавы.

Усе ад мяне адвярнуліся. Мне кідаюць самыя недарэчныя абвінавачванні ў двурушніцтве. Паверце — шлях работы ў БССР быў складаны, цяжкі, але гэты шлях я ішоў толькі ў імя партыі Леніна — Сталіна, пад кіраўніцтвам партыі і яе ЦК. Я пакідаю жыццё з імем партыі і правадыра таварыша Сталіна ў сэрцы. Я пакідаю жыццё, праклінаючы ўсіх ворагаў народа, я праклінаю беларускіх фашыстаў, агентаў польскага імперыялізму.

Я ведаю, што здзяйсняю страшэннае злачынства, але прашу не змешваць мяне з ворагамі народа.

Бывайце, таварышы».

Амаль усё тут у стылі Чарвякова. Чаму — у стылі? Бо арыгінала гэтага развітальнага з нашчадкамі ліста Аляксандра Рыгоравіча няма. Ёсць копія на машынцы. Арыгінал мог быць больш аб'ёмны, мог засведчыць адносіны аўтара да некаторых канкрэтных людзей і падзей. Мог быць і больш абачлівы да некаторых фраз...

Незалежна ад таго, з чыйго рэвальвера трапіла ў А. Чарвякова куля, вывад напрошваецца адзін: у заўчаснай смерці яго вінаваты крывавы сталінізм.

*Валянцін Мыслівец*

# Сучаснае становішча Савецкай Беларусі

*(З даклада на пасяджэнні Прэзідыума ЦВК Саюза 4 чэрвеня 1926 г. аб дзейнасці Урада Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі)*

Наш даклад ужо адзін раз слухаўся на пасяджэнні Прэзідыума ЦВК Саюза ССР. Значыць, задача наша будзе змяшчацца ў тым, каб намаляваць дасягненні Беларускай Рэспублікі за кругабег ад мінулага даклада да гэтага часу. Гэта — першае. Другое — учора матэрыял, які тычыць даклада, быў разасланы членам Прэзідыума ЦВК Саюза ССР, так што яны змаглі азнаёміцца больш падрабязна са становішчам Савецкай Беларусі. Трэцяе — вельмі мала часу, чаму прыйдзецца спыніцца на самых галоўных пытаннях для таго, каб ахарактарызаваць становішча Беларусі.

Першая група пытанняў датычыць развіцця народнай гаспадаркі Савецкай Беларусі. Развіццё Беларускай народнай гаспадаркі ідзе прыблізна тым жа тэмпам і ў тым жа кірунку, як і гаспадарка Саюза ССР цалкам. Уздым гаспадаркі БССР, які адбываўся ва ўмовах надзвычайнага разбурэння пасля вайны, зараз мае значныя вынікі, што дазваляе сказаць аб набліжэнні БССР да заканчэння аднаўленчага кругабегу ў гаспадарчым будаўніцтве. Канчатковае завяршэнне аднаўленчага працэсу ў БССР затрымліваецца з прычыны разбуранасці асноўнага капіталу цэлага шэрага галін народнай гаспадаркі.

### Сельская гаспадарка[1].

Сельская гаспадарка за апошнія тры гады мае значныя дасягненні. Абязладжаная войнамі, якія адбываліся на тэрыторыі нашай Рэспублікі, яна ў 1920 — 21 годзе скарацілася на 30 — 35

[1] Лічбы ўзяты з аднае крыніцы (з матэрыялаў эканам. кам. дакладу Прэзідыума ЦВК Саюза ССР 4/VI—26 г. «Аб дзейнасці Урада БССР»), як у артыкуле т. Адамовіча «Гаспадарчае будаўніцтва СССР і БССР» (Полымя № 4 26 г.), так і ў гэтым артыкуле т. Чарвякова ў аддзеле «Сельская гаспадарка».

прац. адносна даваеннага часу. Зараз яе становішча малюецца наступнымі данымі:

а) пасяўная плошча ў 1924 — 25 годзе перавысіла даваенную на 13 прац., даўшы рост з 2287,3 тыс. дзесяцін у 1923 — 24 годзе да 2493,0 тыс. дзесяцін у 1924 — 25 годзе (+ 9 прац.);

б) ураджай збожжа перавысіў сярэднюю даваенную норму: так, збор з дзесяціны ў пудах быў:

| Сярэдні | 1905 — 13 г. | 1923 — 24 г. | 1924 — 25 г. |
|---|---|---|---|
| Жыта зімовае | 42,4 | 46,0 | 48,1 |
| Ячмень | 47,1 | 45,0 | 51,2 |
| Авёс | 48,3 | 51,0 | 55,7 |
| Ільняное семя | 29,2 | 22,4 | 26,2 |
| Бульба | 432,2 | 432,2 | 548,2 |

в) валавы збор збожжа з году ў год павялічваецца: сабрана было збажыны ў 1923 годзе 84735,7 тыс. пудоў, у 1924 г. — 92703,2 тыс. пуд., у 1925 г. — 100982 тыс.пудоў;

г) тэхнічныя культуры і пасяўныя травы ўсё больш і больш здабываюць сабе месца ў сельскай гаспадарцы, паступова адваёўваючы пасяўную плошчу ад зерневых культур;

д) пашырэнне земдельных ужыткаў шляхам землеўпарадкавання і меліярацыі набывае ўсё больш шырокія памеры з аднachасным пераходам гаспадарак да шматпольных севазваротаў. Землеўпарадкавана да 1925 г. 1830020 дзесяцін, за 1925 г. — 182000 дзесяцін; меліярацыйнымі работамі ў 1924 — 25 годзе было ахоплена забалочанай плошчы 31,5 тыс. дзесяцін, шматпольныя севазвароты арганізаваны ў 1925 г. на плошчы ў 100088 дзес., з іх 73,4 прац. у сёлах і пасёлках;

е) гадоўля жывёлы хутка аднаўляецца, даўшы за мінулы год рост коней — 9,7 прац., буйнога быдла — 10,1 прац., авец — 13,6 прац., свіней — 20,5 прац. У параўнанні з даваенным часам на 100 дзесяцін засеву прыпадае штук жывёлы:

| | 1913 г. | 1925 г. |
|---|---|---|
| Рабочых коней | 29,6 | 27,4 |
| Дарослага буйнога быдла | 58,6 | 47,1 |
| Авец (без ягнят) | 54,5 | 55,2 |
| Свіней (без парасят) | 44,3 | 43,3 |

ж) сельскагаспадарчыя машыны, начынне, насенне і штучныя ўгнаенні ўсё больш і больш трапляюць у сёлы. За 1924 — 25 год сяло атрымала ўсяго гэтага на 162 прац. больш, чымся ў 1923 — 24 годзе;

з) кааперацыйныя аб'яднанні растуць як сваёй колькасцю, гэтак і колькасцю пайшчыкаў: на 1-ае кастрычніка 1924 года

было 849 аб'яднанняў з 48 074 пайшчыкамі, а на 1-ае кастрычніка 1925 г. — 904 аб'яднанні са 122 230 пайшчыкамі, што складае каля 20 прац. сялянскіх гаспадарак.

Такім парадкам, агульныя гадавыя даныя кажуць аб тым, што сельская гаспадарка Беларусі расце колькасна і якасна. Аднак для правільнай ацэнкі гаспадарчага становішча Беларускай Рэспублікі трэба мець на ўвазе, што Рэспубліцы шмат шкодзіць зямельная перанаселенасць і ў гэтым сэнсе яна знаходзіцца ў больш неспагадных умовах, чымся іншыя Рэспублікі Саюза. На адну душу сельскага насялення ў Беларусі прыпадае каля 1,7 дзесяціны зямель сельскагаспадарчага карыстання, з якіх каля 0,3 дзесяціны прыпадае на балоты. З гэтай прычыны беларускае сяло налічвае да 30 прац. лішняй рабочай сілы. Глебы Беларусі бедныя і малаўраджайныя. Дзеля гэтага матэрыяльнае становішча беларускага селяніна застаецца вельмі цяжкім, а адзначаныя вышэй дасягненні з'яўляюцца вынікам упартай і напружанай барацьбы за сваё існаванне. Перад намі ва ўсю веліч пастаўлена праблема перасялення, як адзін з выхадаў з надзвычай цяжкага становішча.

## Прамысловасць

Наша прамысловасць шчыльна злучана ў сваёй дзейнасці з сельскай і лясною гаспадаркаю. Яна грунтуецца, галоўным чынам, на перапрацоўцы сельскагаспадарчай і лясной сыравіны. За мінулыя гады мы маем вельмі значны рост прамысловасці, і яна набывае ўсё большую ўдзельную вагу ў нашай эканоміцы.

Галоўныя даныя, якія малююць становішча прамысловасці, такія:

1. За 1924 — 25 г. асноўны капітал дзяржаўнай прамысловасці, падпарадкаванай Вышэйшаму Савету Народнай гаспадаркі Беларусі, павялічыўся з 9 891,5 тыс. да 11 434,7 тыс., або на 11,6 прац.; уласныя зваротныя сродкі ўзраслі з 6 563,8 тыс. да 9 282,8 тыс., інакш на 41,5 прац.

2. Валавы выраб цэнзавай прамысловасці павялічыўся з 33 167,3 тыс. руб. у 1923 — 24 годзе да 51 311,2 тыс. руб. у 1924 — 25 г. (+ 59,5).

3. Колькасць рабочых, занятых у прамысловай вытворчасці, павялічылася з 11 552 чал. у 1923 — 24 годзе — да 14 738 чал. у 1924 — 25 годзе (+ 27,6 %).

4. Выраб на адзін чалавека-дзень з 4,8 даваенных руб. у 1923 — 24 г. падняўся да 5,86 руб. у 1924 — 25 г. (+ 22 %).

5. Заработная плата дасягнула ў 1924 — 25 годзе 22,8 бюдж. руб. — вышэй на 21,3 % параўнальна з заработнаю платаю ў 1923 — 24 годзе.

У 1925 — 26 годзе мяркуецца затраціць на прамысловае будаўніцтва 5 795,7 тыс. руб. Пераважная колькасць гэтых сродкаў (каля 85 %) ідзе на пераабсталяванне, пашырэнне асноўнага капіталу і пабудову новых заводаў. У мінулым годзе капітальныя затраты пераважна мелі аднаўленчы характар. У 1926 — 27 г. праектуецца выканаць розных будаўнічых работ (прыблізна) на 12 000 000 рублёў.

Асноўныя патрабаванні, што выстаўляюцца прамысловасцю Беларусі, такія:

а) узмацненне фінансавання прамысловасці з пазыкі гаспадарчага аднаўлення на будаўніцтва;

б) уладжванне пытання цэнтрам аб бесперапынным дастаўленні прамысловасці сыравіны і прадметаў тэхнічнага абсталявання, асабліва прывазных.

Побач з гэтым мы маем значны рост мясцовай і прыватнай прамысловасці, а таксама дробна-саматужнай і рамясловай вытворчасці. Агульная колькасць гэтых прадпрыемстваў дасягае 39 348, з якіх 2 766 маюць механічныя рухавікі і ў якіх занята звыш 55 000 рабочых. Пераважная большасць прыватных гаспадарчых адзінак выпадае на долю адзінак саматужнікаў і рамеснікаў (32 516).

Валавы выраб мясцовай прамысловасці дасягае прыблізна каля 15 000 000 руб., што складае палову вырабу ўсёй цэнзавай прамысловасці.

Удзельная вага прыватнай цэнзавай прамысловасці змяншаецца: у 1923 — 24 годзе яна мела 6,7 % рабочых і 8,3 % валавога вырабу, а ў 1924 — 25 годзе — ужо 4,2 % рабочых і 5,6 % вырабу ўсяе цэнзавай прамысловасці.

## Гандаль

Поруч з гэтым ідзе значнае пашырэнне звароту тавараў. Асноўныя даныя, якія датычаць гэтага таваразвароту, з'яўляюцца тымі самымі, што і для ўсяго Савецкага Саюза, чаму на іх падрабязней спыняцца я не буду.

## Бюджэт

Цікава прасачыць рост народнай гаспадаркі, як ён адбіваецца на нашым бюджэце. Расходы БССР, якія падлічаліся ў 1924 — 25 годзе ў 13 272 тыс. рублёў па дзяржаўным бюджэце і ў 19 593 тыс. рублёў па мясцовым, у 1925 годзе выраслі да 26 177 тыс. рублёў па дзяржаўным і да 24 703 тыс. рублёў па мясцовым бюджэце, даўшы адпаведны рост на 90 і 26 %.

Цікавыя даныя, якія малююць рост бюджэту Савецкай Беларусі і іншых Саюзных Рэспублік. Даходы і расходы па дзяржаўным і мясцовым бюджэтах РСФСР, УССР і БССР за 1923 — 24, 1924 — 25 і 1925 — 26 гг. на 1 душу насялення ў рублях выражаліся ў наступных лічбах:

**Даходы:**

| | БССР % | РСФСР % | УССР % |
|---|---|---|---|
| 1923 — 24 г. | 3,47 (100) | 5,33 (100) | 5,61 (100) |
| 1924 — 25 г. | 6,16 (177,8) | 8,44 (158,3) | 8,23 (146,5) |
| 1925 — 26 г. | 9,11 (259,3) | 12,83 (231) | 12,09 (209,3) |

**Расходы:**

| | БССР | РСФСР | УССР |
|---|---|---|---|
| 1923 — 24 г. | 4,18 | 6,19 | 6,10 |
| 1924 — 25 г. | 5,92 | 9,11 | 7,97 |
| 1925 — 26 г. | 9,68 | 11,35 | 12,48 |

З гэтых даных відаць, што павелічэнне даходаў і расходаў па бюджэце на 1 душу насельніцтва Беларусі ідзе ўсё больш узмоцненым тэмпам і нават хутчэй, чымся ў іншых рэспубліках. Аднак з гэтых жа даных відаць, што забеспячэнне БССР сродкамі адстае ад яе суседзяў, хоць ясна відаць, што СССР імкнецца ўсякімі спосабамі дапамагчы Беларусі, каб нагнаць апярэдзіўшых суседзяў і гэтым даць ёй мажлівасць гаспадарча і культурна развівацца.

## Агульныя ўмовы працы ў Беларусі

Трэба сказаць, што нашу работу ў галіне гаспадарчага будаўніцтва прыходзіцца весці ва ўмовах 1) зямельнага перанасялення сяла, 2) эканамічнага развалу нашых мястэчкаў. Паводле нашых падлікаў, беларускае сяло дае да 30 % лішкаў рабочай сілы; мястэчкі, эканамічна аслабелыя, не маючы эканамічнага грунту для свайга развіцця, даюць агромністы лік беспрацоўных.

## Яўрэйскае пытанне

Спынюся на нашых эканамічных мерапрыемствах, якія палягчаюць становішча яўрэйскага насялення. Мы выбралі два шляхі: 1) надзяленне яўрэйскага насялення зямлёй і 2) залучэнне яўрэйскага насялення на нашы фабрыкі і заводы. У

мінулым годзе нам удалося прыстасаваць каля 5000 душ яўрэйскага насялення на зямлю, вылучыўшы для гэтай патрэбы зямельнага фонду каля 10 000 дзесяцін. У гэтым годзе тэмп надзялення яўрэяў зямлёю пойдзе некалькі марудней, бо вылучыць вольныя плошчы вельмі цяжка — прыходзіцца вызначаць для гэтага некаторыя лясныя ўчасткі. Але ўсё ж у гэтым годзе мы думаем прыстасаваць яўрэяў прыблізна на 5 000 дзесяцін. Адзначу, што нашы мерапрыемствы ў гэтым кірунку сустракаюць шчырае падтрыманне з боку беларускага сялянства. У значнай ступені аслабленню цяжкага эканамічнага становішча мястэчкаў будуць спрыяць ільготы, якія даюцца саматужнікам і рамеснікам.

## Культурная праца

Наша Рэспубліка самая непісьменная з усіх частак Савецкага Саюза, апрача Туркменістана, Узбекістана. На 1 000 душ насялення ў 1920 годзе пісьменных прыходзілася: па еўрапейскай частцы РСФСР — 434, Паўночным Каўказе — 356, Украіне — 416, Беларусі — 327. Пісьменных жа ў сельскіх мясцовасцях на 1 000 душ насялення налічвалася 276 чалавек. Калі ж вылічыць адсюль вучняў, то атрымаем яшчэ меней: 25,92 %. Імкненне з боку насялення ў школы надзвычайна вялікае. Паводле нашых падлікаў, імкненне ў школы ў нас мацней, чымся ў іншых частках Савецкага Саюза. Наплыў дзяцей у школы выражаецца наступнымі лічбамі (у працэнтах) па Саюзу ССР — 13,9, па РСФСР — 13, па УССР — 16, а па БССР — 24,3.

Колькі дзяцей забяспечана зараз школамі? Да вайны ў межах Беларусі навучалася дзяцей у веку ад 8 да 11 год — 39 %; у гэтым годзе гэты працэнт падняўся да 68. За бартом, такім чынам, астаецца 32 % дзетвары. Шмат горай ідзе справа з дзецьмі ад 12 да 15 год. Такіх дзяцей у школах навучаецца ўсяго — 12 %, а ў сельскіх мясцовасцях — 6 %. Другая ступень не ўбірае патрэбнай колькасці дзяцей — не хапае сямігодак. Мы разглядаем гэта як дачаснае з'явішча. У цэнтральным прамысловым раёне навучаецца, як ведама, ужо 91,2 % дзяцей ад 8 да 11 г., у Паўночна-Заходнім — 89,2 %.

Павелічэнне колькасці дзяцей школьнага веку ў школах ідзе за рахунак нагрузкі на настаўніка. Лік школ расце марудней, чымся лік жадаючых паступіць у школы. Нармальна, як ведама, на аднаго настаўніка палагаецца група ў 40 вучняў.

Я лічу, што для пераходнага часу нармальнай групай у Беларускай Рэспубліцы можна лічыць групу ў 40 вучняў.

Між тым, паводле даных ЦСУ СССР, на 1 студзеня 1925 года на аднаго настаўніка прыходзілася: у СССР — 34,7 вучня, РСФСР — 34,1, УССР — 37,8, БССР — 38,2. У сельскіх жа мясцовасцях у школах-прымітыўках нагрузка яшчэ большая: у СССР — 41,5, РСФСР — 41,9, УССР — 40,4, БССР — 49,4.

Расходы, якія Савецкая Беларусь робіць на народную асвету, растуць штогодна. Параўнальна з 1923 – 24 годам гэтыя расходы выраслі ў паўтара разы ў 1924 — 25 годзе; а ў гэтым годзе, параўнальна з 1923 — 24 г., прыкладна ў 3 разы.

Мы апрацавалі план усеагульнага навучання. Паводле нашых падлікаў, мы зможам ажыццявіць гэты план усеагульнага навучання прыкладна ў 10 год.У гэтым годзе мы пачалі яго ажыццяўляць. У пагранічных раёнах нам удасца збыць непісьменнасць у 5 год. Польскі ўрад у адзнаку вызвалення ад бальшавікоў будуе на граніцы касцёлы. Мы ж на сваіх граніцах у адзнаку вызвалення ад белапалякаў будуем школы.

Цікавыя даныя аб развіцці прафесіянальна-тэхнічнай асветы. У нас існуе: тэхнікумаў — 23, праф.-тэхн. школ — 29, іншых — 20. Варта таксама адзначыць, што нам удалося замацаваць і забяспечыць развіццё вышэйшых школ Беларусі: Універсітэта, Сельскагаспадарчай Акадэміі, КАМВУЗа і Ветэрынарнага Інстытута.

Такім чынам, і гаспадарчы, і культурны рост мае месца ў нашай Савецкай Беларусі. У сувязі з гэтым мы маем значны рост палітычнай актыўнасці насялення.

Даныя аб перавыбарах у Саветы лепш за ўсё характарызуюць гэты рост.

## Перавыбары ў Саветы

У гэтым годзе мы правялі перавыбарную кампанію на грунце інструкцыі ЦВК Саюза ССР, разасланай усім нам у якасці кіраўніцтва. Паасобку для нас меў вялікае значэнне артыкул 18 гэтай інструкцыі, дзе гаварылася аб тым, хто не пазбаўляецца права выбараў у Саветы. Гэты артыкул, трэба сказаць, выклікаў у нас агромністы палітычны эфект. Атрымаўшых права выбару па гэтай інструкцыі ў нас даволі многа.

Перавыбарную кампанію мы правялі дакладна, грунтуючыся на інструкцыі ЦВК Саюза ССР, ужываючы рассылку позваў, вызначаючы выбарныя ўчасткі, праводзячы папярэднія справаздачныя кампаніі і, урэшце, праводзячы сходы беднаты.

Трэба сказаць, што лозунг аб рабоце сярод беднаты быў даны, як належыць, своечасна. Мы правялі шырокую кампанію сярод беднаты, склікаючы сходы, прычым дапускалі на гэтыя

2 Зак. 5587

М 286805

сходы і серадняко́ў. Мы ставілі ў парадку дня пытанні гаспадарчага будаўніцтва, мерапрыемствы Савецкага Урада, накіравання да паляпшэння гаспадарчага становішча бедняты, і выступленні адзіным фронтам беднякоў і серадняко́ў на выбарах супраць кулакоў і іншых процісавецкіх элементаў. Гэтыя сходы былі надзвычайна шматлікімі і актыўнымі; яны выклікалі энтузіязм з боку бяднейшага насялення і спрыялі шчыльнаму аб'яднанню серадняко́ў і бедняты. Сераднякі ахвотна ішлі на гэтыя сходы і пасля іх выступалі на выбарах адзіным фронтам з беднатой.

Грунтам яднання серадняко́ў і беднякоў было імкненне пабудаваць жыццё па-новаму і правесці землеўпарадкаванне. Вось асноўны вузел, вакол якога скрыжоўваліся інтарэсы серадняко́ў і беднякоў. Сераднякам абрыдла валакіта з правядзеннем землеўпарадкавання. Яны разумеюць, што Савецкая ўлада будзе падтрымліваць бедняту, і пагэтаму яны былі на яе баку.

Некалькі слоў аб актыўнасці насялення. У перавыбарную кампанію ў нас прымала ўдзел 48 прац. насялення. Па асобных акругах гэты працэнт павялічваўся. Так, напрыклад, у Мазырскай акрузе ўдзел выбаршчыкаў дасягаў 54 прац., Барысаўскай — 52 прац., Калінінскай — 55 прац., Полацкай — 55 прац. Па асобных выбарных участках на сходы з'яўлялася да 80 прац.

Удзел у перавыбарах саматужнікаў і раней пазбаўленых, а цяпер, паводле арт. 18 інструкцыі, атрымаўшых права выбараў, быў надзвычайна актыўным. Мы маем у некаторых выпадках арганізаваныя актыўныя выступленні.

Надзвычайна нязначнай у гэтых выбарах была роля Саюза працаўнікоў зямлі і лесу. Гэты Саюз не адыграў той ролі, якую павінен быў адыграць.

Удзел інтэлігенцыі колькасна быў надзвычайна актыўным. Амаль усе 100 прац. з'явіліся на выбары. Але ў гэтым годзе настаўнікі і іншая інтэлігенцыя на выбарах была пасіўнай: здымала свае кандыдатуры, не выступала актыўна ў абарону тых кандыдатур, якія мы хацелі правесці. У чым жа справа? На настаўніцкім з'ездзе мы ставілі гэтае пытанне. Аказваецца — нежаданне сварыцца з заможным сельскім элементам, нежаданне прымаць удзел у класавай барацьбе сяла, ідэя агульнага сялянскага, агульнага нацыянальнага фронту часта мела вялікае значэнне.

Найбольш характэрным фактам для перавыбарных кампаній гэтага года з'ўляецца: праяўленне групавой барацьбы розных сацыяльных пластоў сялянства ў кірунку заваявання Саветаў. Гэта асабліва яскрава выявілася: 1) пры ацэнцы дзейнасці даваўшых справаздачы органаў на выбарных сходах, калі кулацкая частка падавала прапазіцыі, якія ганьбілі дзейнасць

сельсавета альбо райвыканкома, а бедната і сераднякі — выказвалі сваё адабрэнне; 2) пры выбарах прэзідыумаў; 3) пры выбарах падлічальнікаў і ўтварэнні паўторных падлікаў. Былі выпадкі, калі той альбо іншай групе не ўдавалася правесці сваіх кандыдатаў, дэманстратыўнага пакідання сходу групамі пасля іх паражэння.

Бядняк і серадняк у пераважнай большасці выпадкаў выступалі супольна супраць заможных і кулакоў, упарта і актыўна баронячы сваіх кандыдатаў у Савет. Зрэдку нагляд даліся моманты, калі серадняк часткова ішоў за кулаком, як, напрыклад, у адным выбарным пункце Суражскага раёна Віцебскай акругі адзін серадняк выступаў супраць беднякоў, кажучы, што беднякоў не трэба выбіраць у Саветы і што Савецкая ўлада трымаецца толькі на серадняках і кулаках. У другім выбарным пункце Гайнаўскага сельсавета (Новая Гайна) Лагойскага раёна Менскай акругі сераднякі арганізаваліся з багатымі хутарамі і правалілі кандыдатуры беднякоў у сельсавет.

Заможны і кулак актыўна выстаўлялі сябе супраць бедняка і серадняка, іншы раз відочна, а часамі шляхам вярбоўкі серадняка і склікannем нелегальных сходаў.

Прыслужнікі рэлігійных культаў — папы, дзякі і ксяндзы ў некаторых месцах таксама прымалі ўдзел у арганізацыі кулацтва. Так, напрыклад, у Капыльскім раёне Слуцкай акругі гэтая група насялення цераз кулакоў хацела правесці старшыню касцёльнай пяцёркі і дачку папа (апошняя папала ў сельсавет, але на пленуме зняла сваю кандыдатуру) і іншых пажаданых ім кандыдатаў.

Апрача некаторых выпадкаў, спробы кулацтва ўсюды не мелі поспеху; шмат дзе кулакі былі зможаны ўжо ў часе перадвыбарнай кампаніі, і, страціўшы ўсякую надзею прайсці ў Савет, рабілі спробы сарваць сход, або не з'яўляліся на выбары. Былі і такія выпадкі, калі пасля няўдачы кулакі ў рэзкіх формах скардзіліся ў ЦВК, прыводзячы розныя факты фармальнага характару, асабліва там, дзе кіраўнікі перавыбараў не ў належнай меры былі практычныя і давалі зачэпкі для скаргаў. Так, напрыклад, у Верхачанскім сельсавеце Полацкай акругі кулакі зрабілі фальшывыя подпісы ад некалькіх сёл і падалі скаргу, ускладаючы шэраг абвінавачанняў на сельсавет, скарыстаўшыся тым, што былі зроблены некаторыя тактычныя памылкі; у Кражаскім сельсавеце Барысаўскай акругі арганізаваўшаяся група кулакоў пабыла на ўсіх выбарных участках і пасля няўдач скардзілася па тэлеграфу ў ЦВК у рэзкім тоне, вінавацячы выбраны сельсавет у адміністрацыйным нажыме і розных злачынствах. Пасля праверкі факты не пацвердзіліся, і выявілася, што гэтая група вяла напружаную работу за сваіх

кандыдатаў, дзеючы рознымі спосабамі: зрывам сходаў, спойваннем і інш.

Адносна перавыбараў з боку мясцовых выбарных камісій была вытрымана правільная лінія. Мы пазбеглі адміністрацыйнага нажыму. Было непаразуменне ў Быхаве, дзе некалькі перастараліся. Пэўную ролю адыгралі нашы вылучэнцы, як у сэнсе высвятлення перад масамі пытанняў савецкага будаўніцтва, гэтак і ў сэнсе залучэння насялення ў выбарныя кампаніі. У гэтым годзе нам удалося абнавіць нашы сельскія саветы на 45 — 46 прац., старшынь райвыканкомаў — на 25 — 30 прац.

У дачыненні складу нанова выбраных сельсаветаў можна адзначыць наступнае:

а) вельмі нязначны працэнт батракоў;

б) зніжэнне прац. бясконных;

в) павелічэнне прац. вызваленых ад сельскагаспадарчага падатку з прычыны незаможнасці;

г) некаторае зніжэнне працэнту жанчын;

д) павелічэнне працэнту членаў і кандыдатаў КПБ і членаў ЛКСМБ.

### Аб актыўнасці насельніцтва

Цікавыя наступныя даныя, якія характарызуюць актыўнасць насялення.

Тыраж газет, якія выходзяць у БССР, дасягае 90 670, што дае адну газету на 46,2 душ насялення.

Калі ж узяць лічбу беларускіх і ўсесаюзных газет, то выйдзе, што адна газета прыходзіцца на 25,7 чалавек.

Часопісаў у БССР выходзіць 12 з тыражом 35 950. Дзякуючы эканамічнаму ўздыму беларускага сяла газеты пачынаюць усё больш туды трапляць. Апроч нашых акруговых газет сяло выпісвае: 23 000 экз. «Крестьянской газеты», 8 968 — «Бедноты» 3107 — «Батрака».

Камітэты ўзаемадапамогі ахапляюць на грунце добраахвотнага членства каля 90 прац. сялянскага насялення.

### Палітычныя настроі насялення

Палітычныя настроі асобных груп насялення можна ахарактарызаваць прыкладна такім чынам:

*Настрой рабочых* цвёрда-савецкі. Калі і ёсць нездаволенасць, дык яна зыходзіць ад нездаволенасці асобнымі настроямі, ад жадання збыць іх, выправіць, узмацніць Саветы.

Рабочыя нездаволены: а) рэальным зніжэннем заработнай платы, б) цяжкімі кватэрнымі ўмовамі, в) выпадкамі безгаспадарчасці адміністрацыі, высокімі невытворчымі расходамі ў некаторых трэстах і заводаўпраўленнях, г) выпадкамі ненармальных адносін адміністрацыі да рабочых, д) выпадкамі невыканання ўмоў аховы працы (як з прычыны нядбайнасці, няўважлівасці, нераспараджальнасці адміністрацыі, гэтак і з прычыны спаханасці асноўнага капіталу), ж) слабасцю работы заўкомаў, а таксама некаторымі ненармальнасцямі ў дзейнасці прафсаюзаў.

Яскравым паказальнікам палітычнага становішча на сяле з'яўляюцца перавыбары Саветаў. Мы маем павелічэнне актыўнасці ўсіх пластоў сяла, арганізаваную актыўнасць беднаты ў раёнах, дзе праведзены былі сходы беднаты, узмацненне блоку беднаты з серадняками, часам з перавагаю на баку беднаты там, дзе была праведзена партыяй падгатоўчая работа, яшчэ большае прыбліжэнне да Савецкай улады сельскага настаўніка. Блок кулака з серадняцкай верхавінкай, пры бліжэйшым удзеле процісавецкай інтэлігенцыі, былых людзей (духавенства), пры скарыстанні хуліганячага элементу; максімальную актыўнасць кулака і блокуючыхся з ім пры перавыбарах у барацьбе супраць бядняцка-серадняцкага блоку (мабілізацыя на выбарах сваіх прыхільнікаў, падкуп і спойванне беднякоў і серадняткоў, спробы да зрыву сходаў, выстаўленне кандыдатур жанчын, асобных беднякоў і серадняткоў, якія знаходзяцца пад кулацкім уплывам для ўчынення расколу ў бядняцка-серадняцкім блоку і гэт. дал.). Прыкметны рост палітычнай актыўнасці процісавецкай інтэлігенцыі, былых людзей, духавенства ў сяле ў справе арганізацыі і афармлення процігарадскіх, проціпралетарскіх і процісавецкіх тэндэнцый (верхавінкі сяла); арганізаваны ўдзел у стварэнні кулацкага блоку з серадняцкай верхавінкай супраць бядняцка-серадняцкага блоку; агітацыя супраць Савецкай улады, як улады гарадской, якая аграбляе сялян; процістаўленне сялян рабочым; агітацыя за лозунгі самаарганізавання сялян у свае саюзы; палітычнае афармленне нездаволенасці сялян асобнымі памылкамі, промахамі і злажыццямі нізавога савецкага апарату, шляхам абагулення і абвастрэння, часта зусім правільных, папрокаў асобных сялян і гэт. дал.).

Нездаволенасць сялян выяўляецца ў наступным: а) папрокі ў вострай форме на нізавы савецкі апарат (п'янства, цяганіна, бюракратычнасць, нядбайнасць да справы, грубасць, сувязь з кулакамі і залежнасць ад іх, растраты, хабарніцтва, пратэкцыянізм), слабасць кааперацыі (растраты), слабасць камітэтаў узаемадапамогі; б) марруднасць правядзення землеўпарадкавання, марудпасць лесаўпарадкавання, невыстарчальны водпуск

лесаматэрыялаў, апалу, скаргі на леснікоў за зачыноўленасць, хабарніцтва, пратэкцыянізм, невыстарчальнасць пашы і сенажаці; в) слабасць культурна-асветнай работы — недахоп хат-чытальняў, невыстарчальнасць школьнай сеці, падручнікаў, медыцынскай і ветэрынарнай дапамогі; г) патрабаванні аб дачы даўгачаснага крэдыту, пашырэнні крэдыту, спрашчэнні сістэмы крэдытавання; скаргі беднякоў на вельмі малую дапамогу дзяржавы; д) высокія цэны на прамтавары і сельскагаспадарчыя машыны, скаргі на недахоп прамысловых тавараў; е) мяккасць карнай палітыкі адносна да растрат, службовых праступкаў і хуліганства на сяле.

Асноўнымі контррэвалюцыйнымі сіламі ў Беларусі з'яўляецца духавенства, затым — сіяністы. Мы лічым, што імі вядзецца арганізаваная планамерная работа. Трэцяя контррэвалюцыйная сіла — працісавецка настроеная інтэлігенцыя: былыя людзі, афіцэрства, якое не прымірылася са стратай мінулага, і гэт. дал. Гэтая сіла розніцца тым, што яна не арганізавана і дзейнічае паадзінцы. Яна небяспечна тым, што ў выпадку нарастання якіх-небудзь ускладненняў можа абрастаць для таго, каб дзеяць супраць нас больш актыўна.

Мы маем духавенства праваслаўнае і каталіцкае. Праваслаўнае ў значнай ступені згубіла свой аўтарытэт у звязку з расколамі. Але гэта не азначае, што рэлігійныя настроі ў сябе збыты. Вакол кожнага папа ёсць асаблівы актыў, які ў патрэбную хвілю яго абараняе. Царкву мала наведваюць, але гэта не зяўляецца паказальнікам слабасці рэлігійных настрояў. Вакол папа, як я ўжо казаў, ёсць актыў, які, па-першае, забяспечвае папа матэрыяльна, па-другое, клапоціцца аб дабрабыце царквы, па-трэцяе, выступае актыўна ў абарону папа, калі яму што-небудзь пагражае.

Але шмат большую небяспеку ва ўмовах Беларусі мае каталіцкае духавенства. Гэтае духавенства карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод фанатычна настроенага насялення. Яно небяспечна яшчэ і тым, што палітычна звязана з закардонам. Так, біскуп жыве ў Польшчы і ксяндзоў для Беларусі назначае адтуль.

## Інтэлігенцыя

Ва ўмовах Беларусі інтэлігенцыя з'яўляецца актыўнай сілай, асабліва ў нацыянальным руху. У апошні час мы маем магчымасць зазначыць значныя набліжэнні інтэлігенцыі да Савецкай улады і ідэй камунізму, хоць гэты працэс ідзе побач з далейшай крышталізацыяй нацыянал-дэмакратычных настрояў і ідэй. Данае з'явішча мае для Беларусі тым большае значэнне, што

настроі беларускай інтэлігенцыі знаходзяцца ў поўным узаемадачыненні з настроямі закардоннай інтэлігенцыі. Уцалку беларуская інтэлігенцыя, пры агульнасавецкім настроі яе пераважнай большасці, паводле сваіх палітычных поглядаў можа быць падзелена на наступныя групы: 1) група, якая прымае асноўную лінію партыі і працуе з ёю поруч; гэтая група набіраецца, галоўным чынам, з нізавой інтэлігенцыі; 2) група, якая прыхільна да супрацоўніцтва з Савецкаю ўладаю, але падпадае пад уплыў, часам даволі значны, нацыянал-дэмакратычных настрояў; 3) група палітычна пасіўная; 4) група, варожая нашай палітыцы, хоць часта прыкрываецца паказной савецкай лаяльнасцю.

Асноўнымі момантамі фармуючайся нацыянал-дэмакратычнай ідэалогіі з'яўляюцца: 1) адмаўленне дыктатуры пралетарыяту, 2) імкненне да палітычнага ўраўнавання сялянства з рабочым класам і да так званай агульнасялянскай улады, 3) стаўка на кулацкія элементы сяла, якая часта прыкрываецца замазваннем класавага расслаення ў ім, 4) імкненне да ўплыву на дзяржаўны апарат, з мэтай змены яго сацыяльнай істоты, 5) праявдзенне беларускага шавінізму і наступальная лінія ў дачыненні да нацыянальных меншасцяў.

Нацыянал-дэмакратызм у Савецкай Беларусі знаходзіць свой сацыяльны грунт у настроях буржуазнай верхавінкі сяла, палітычную ідэалогію якога ён аб'ектыўна прызваны прадстаўляць.

Будзе памылкаю перавялічваць памеры гэтай небяспекі і прадстаўляць сабе такія настроі, як нешта зусім аформленае. Аднак яшчэ большаю памылкаю з'явілася б недаацэнка захаванай сілы нацыянал-дэмакратычнага руху, маючы на ўвазе няўхільнасць далейшага расслаення сяла.

Настроі яўрэйскай, велікарускай і невялікага кадру польскай інтэлігенцыі ўцалку адпавядаюць настроям беларускай інтэлігенцыі. Разніца змяшчаецца ў тым, што нацыянал-дэмакратычны настрой яўрэйскай інтэлігенцыі выліваецца ў форму сіянізму, які павялічваецца цяжкім эканамічным становішчам мястэчка. Сярод савецкай часткі яўрэйскай інтэлігенцыі заўважаецца спецыфічная туга па яўрэйскай дзяржаўнасці. Значная праслойка велікарускай русіфікаванай інтэлігенцыі менш актыўна ў агульных палітычных пытаннях. Сярод польскай інтэлігенцыі расце савецкая актыўнасць нізавых яе слаёў.

Для прыкладаў двухбаковага працэсу сярод інтэлігенцыі можна падаць шэраг фактаў. Увосень 1925 года ў Берліне адбыўся з'езд прадстаўнікоў беларускіх грамадскіх і палітычных арганізацый, на якім было пастаўлена пытанне аб адносінах да Савецкай Беларусі. Большасць дэлегатаў, якая прадстаўляла найбольш сумленныя колы беларускай інтэлігенцыі за кардонам,

вывучыўшая становішча Савецкай Беларусі, яе ўзаемадачыненні з Савецкім Саюзам, прынцыпы і практыку нацыянальнай палітыкі Савецкай улады, прайшла да вываду аб тым, што толькі Савецкая ўлада забяспечвае эканамічнае і культурнае развіццё Беларусі. Гэтая група, на чале якой стаяў А. Цвікевіч, пастанавіла скасаваць урад так званай Беларускай Народнай Рэспублікі, *перадаўшы паўнамоцтвы ўраду Савецкай Беларусі і прызнаўшы Менск палітычным, эканамічным і культурным цэнтрам для ўсіх беларускіх тэрыторый.* Гэты факт сведчыць аб тым, што працэс набліжэння інтэлігенцыі да Савецкай улады ідзе ўпярод. Аднак, побач з гэтым, мы можам на прыкладзе так званай «лістападаўшчыны» паказаць, што нацыянал-дэмакратычныя настроі, варожыя Савецкай уладзе, таксама выяўляюцца ў асобных прадстаўніках інтэлігенцыі, хоць у той жа час мы можам смела заявіць, што «лістападаўскія» настроі не знаходзяць сабе водгуку сярод шырокіх колаў беларускай інтэлігенцыі.

## Нацпалітыка Савецкай Беларусі

Агромністае значэнне ў замацаванні савецкіх настрояў сярод розных груп насялення адыграла наша нацыянальная палітыка. Істота нацыянальнага пытання ў БССР вызначаецца наступнымі момантамі, якія характарызуюць агульнае становішча і задачы Беларусі:

1. Гаспадарчы заняпад і дэзарганізацыя Беларусі, якія стварыліся ўсёю дарэвалюцыйнай гісторыяй краіны і паласою франтоў, якая праходзіла праз краіну па некалькі разоў і якія ў значнай меры ўзмоцнены прыроднымі ўмовамі БССР.

2. Культурны заняпад, які, з аднаго боку, спадарожнічае з нізкім узроўнем дабрабыту і быту насялення, а з другога, абумоўлен усёй палітыкай царскага ўрада — прыдушэння беларускай культуры, ганебнасці на мову і літаратуру. Гэтае самае датычыць польскага і яўрэйскага насялення краіны.

3. Нацыянальнымі супярэчнасцямі, якія змяшчаюцца ў тым, што нацыянальныя і сацыяльныя адзнакі, на моцы гістарычных умоў, шчыльна перапляліся, адклаўшы тоўсты пласт нацыяналістычных забабонаў, адрозненасці і варожасці, і, што асабліва важна, аддзялілі горад ад вёскі шмат разчэй, чымся ў іншых раёнах.

Таму ўся работа ў БССР праводзілася ў трох асноўных кірунках: аднаўленне гаспадаркі, культурнае развіццё і ўмацаванне міжнацыянальных адносін.

Адзначаная вышэй характарыстыка гаспадарчых дасягненняў у Беларусі з'яўляецца лепшым адказам аб рабоце ў кірунку

аднаўлення беларускай гаспадаркі пры дапамозе Савецкага Саюза. У галіне культурнага будаўніцтва мы можам адзначыць шэраг вялікіх дасягненняў. Беларуская мова паступова становіцца мовай выкладання ва ўсіх школах, дзе вучацца беларускія дзеці, а ва ўсіх іншых школах уведзена як абавязковы прадмет. Так, у гэтым годзе ва ўсіх школах сацыяльнага выхавання, у мясцовасцях з пераважным беларускім насяленнем, выкладанне вядзецца ўжо ва ўсіх класах на беларускай мове, а у школах, мясцовасцях, далучаных у 1924 годзе, — у першых трох групах, з выкладаннем беларускай мовы ў іншых класах.

Побач з гэтым ёсць адпаведная колькасць школ і іншых нацыянальнасцей. Апошнія паводле нацыянальнага характару размяркоўваюцца ў такім парадку:

| | Яўрэйскіх | Польскіх | Рускіх | Латвішскіх | Нямецкіх | Эстонскіх |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Чатырохгодак | 134 | 96 | 34 | 16 | 1 | 1 |
| Сямігодак | 41 | 5 | 29 | 16 | - | - |
| Педтэхнікумаў | 2 | 1 | - | - | - | - |

Ва ўсіх педтэхнікумах выкладанне прадметаў ідзе на роднай мове вучняў. Апроч гэтага, ў гэтым годзе на педагагічным факультэце Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта 57 дысцыплін чытаецца на беларускай мове, што складае 252 гадавых гадзіны з агульнага ліку 650 гадзін (у мінулым годзе чыталася толькі 13 дысцыплін у 68 гадзін); у сваю чаргу, на яўрэйскім аддзяленні факультэта частка прадметаў пачала чытацца на яўрэйскай мове (галоўным чынам методыка).

Аналагічны малюнак назіраецца і адносна рэшты асветных устаноў. Так, на яўрэйскай мове працуе зараз 6 клубаў, два рабочых Універсітэты, тры вячэрнія партшколы, дзве школы ЛКСМБ, 33 лікпункты, а таксама ёсць дзве бібліятэкі; на польскай мове: 18 хат-чытальняў, 39 бібліятэк, 5 клубаў, 44 чырвоныя куткі і 43 лікпункты. Апрача гэтага, з восені прыступіць к рабоце адчыняемы ў Мінску Яўрэйскі Дзяржаўны тэатр. Вывучэнне ж культур нацыянальных меншасцяў праводзіцца цераз адпаведныя секцыі Інстытута Беларускай Культуры.

Ёсць значныя дасягненні і ў галіне задавальнення падручнікамі і навучальнымі падсобнікамі школ нацыянальных меншасцяў. Вялікія вынікі ёсць у рабоце Беларускага Дзяржаўнага Тэатра. Скончана праца па падгатоўцы двух драматычных студый — беларускай і яўрэйскай. Выпуск беларускай літаратуры, параўнальна з мінулым годам, павялічыўся на 150 прац, яўрэйскай — на 250 прац, польскай — на 366 прац. У складзе выбарных савецкіх органаў значна падняўся працэнт беларусаў: у акруговых выканаўчых камітэтах — з 48 да 63, у

раённых выканаўчых камітэтах — з 75 да 80, у сельсаветах — з 84 да 91. Па лініі Чырвонай Арміі ёсць значныя дасягненні па беларусізацыі ў Аб'яднанай Беларускай Школе каманднага і палітычнага складу і тэрытарыяльных дывізіях.

Выбарныя ўчасткі па перавыбарах у Саветы вызначаліся дапасоўна да насялення нацыянальных меншасцяў. Арганізаваныя ж у шмат якіх месцах нацыянальныя выбарныя пункты далі насяленню нацыянальных меншасцяў магчымасць удзелу ў перавыбарнай кампаніі і пасланць сваіх прадстаўнікоў у Саветы.

Апроч існаваўшых да гэтага года 19 нацыянальных Саветаў арганізавана яшчэ 22 паводле намечанага плана памяншэння сельскіх Саветаў і ўтварэння местачковых.

У выбарах нацыянальныя меншасці прымалі даволі выстарчальны ўдзел, асабліва ў выбары местачковых Саветаў, дзе галоўнай актыўнай сілай з'яўляецца саматужнік. Прычым выявілася, што нацыянальныя меншасці ў часе перавыбараў у большасці адстойвалі ў сваім складзе класавыя інтарэсы поруч з бедняком і серадняком беларускай нацыянальнасці. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў выбіраліся прыкладна ў аднолькавай прапорцыі параўнальна з рэштай беларускага насялення. У гэту кампанію працэнт выбраных у Саветы палякаў і латышоў, у звязку з арганізаваннем нацыянальных саветаў, хоць і нязначна, павялічыўся. Здараліся выпадкі, праўда адзінкавыя, нежадання слухаць даклад на роднай мове (у адным яўрэйскім паселішчы Селіцкага сельсавета Бабруйскай акругі і латышскім — Рудабельскага с/Савета гэтай жа акругі).

Мы ўпаўне ўлічваем, што ў нашай рабоце ў галіне нацыянальнай палітыкі ёсць яшчэ шмат недахопаў, але ўсё ж можам зазначыць, што кірунак і тэмп работы намі ўзяты правільна.

Трэба асобна адзначыць работу нараджэнца Кастрычніцкай Рэвалюцыі — Інстытута Беларускай Культуры, які з'яўляецца ў нас асновай для будучай Беларускай Акадэміі Навук.

Інстытут Беларускай Культуры, на чале якога стаіць У.М. Ігнатоўскі, арганізаваўся ў 1921 годзе, як навукова-тэрміналагічная камісія ў складзе 18 працаўнікоў. У 1922 годзе Інстытут ужо існуе ў складзе дзвюх камісій: мовазнаўчай і прыродазнаўчай. У 1925 годзе Інстытут разгарнуўся да сучаснага яго становішча і набыў да 100 працаўнікоў. З 1926 г. Інстытут Беларускай Культуры афармляецца як установа, якая лічыцца пры Савеце Народных Камісараў, атрымлівае сталы бюджэт і гэтым забяспечвае выкананне пастаўленых перад сабою задач. З гэтага мы бачым, як Інстытут даводзіць сваю жыццёвасць на рабоце, паступова яе разгортваючы і займаючы больш выдатнае месца на ўсёй сістэме ўстаноў БССР. Зараз Інстытут Беларускай Культуры з'яўляецца прызнанай у Беларусі

ўстановай, у задачы якой уваходзіць навукова-планавае даследванне Беларусі, яе прыроды, эканомікі, этнаграфіі, мовы, літаратуры, гісторыі і г.д. Секцыямі і камісіямі Інбелкульту ўжо пастаўлена вывучэнне прыроды і гаспадаркі, гісторыі, мовы і літаратуры. Некалькі слабей пастаўлена і арганізуецца вывучэнне этнаграфіі, эканомікі і права. Вялікае значэнне і месца ў рабоце Інбелкульта займаюць нацыянальныя аддзелы — яўрэйскі і польскі. Асабліва шырока разгарнуў сваю работу аддзел яўрэйскай культуры. Мяркуецца арганізаваць яшчэ і латышскі аддзел. Інбелкульт зараз складаецца з 77 сталых членаў, 69 членаў-супрацоўнікаў і 60 членаў-дапісчыкаў. Паводле нацыянальнага складу працаўнікі Інстытута размяркоўваюцца так: беларусаў — 120, яўрэяў — 40, палякаў — 22, рускіх і іншых — 24.

Вялікай асаблівасцю Інстытута Беларускай Культуры з'яўляецца яго сувязь з шырокімі масамі працоўных. Так, краязнаўчае бюро, якое працуе на правах камісіі Інбелкульта, яднае вакол сябе каля 4 500 членаў, якія працуюць галоўным чынам на сяле. Аб'яднанне беларускіх пісьменнікаў «Маладняк» таксама налічвае каля 500 чалавек, якія паходзяць з рабочых і сялянскіх мас. Усё гэта сведчыць аб тым, што Інстытут Беларускай Культуры глыбока пусціў карэнні ў Беларусі і што асноўны характар і змест яго работы вядуць да далейшага разгарнення і афармавання яго ў выглядзе Беларускай Акадэміі Навук.

Работа і дасягненні Савецкай Беларусі выклікаюць вялікую цікавасць за рубяжом, асабліва сярод беларускіх палітычных і грамадскіх арганізацый. Асабліва шмат увагі надаецца факту пашырэння Беларусі. Гэты палітычны факт выклікаў зрушэнне ў настроях беларускай зарубежнай інтэлігенцыі і прывёў яе лепшую частку да Берлінскай канферэнцыі і скасавання Урада Беларускай Народнай Рэспублікі. Нават група клерыкалаў, якая яднаецца вакол тыднёвіка «Крыніца» і на чале якой стаіць ксёндз Станкевіч, адзначыла гэты факт як станоўчы. Але трэба сказаць, што сярод варожых Савецкай уладзе элементаў беларускіх нацыяналістаў і зараз яшчэ лічыцца невыстарчальным зробленае пашырэнне, бо, па іх думцы, у склад Беларусі павінны ўвайсці толькі па нацыянальнай адзнацы яшчэ і некаторыя іншыя тэрыторыі на ўсход ад сучасных граніц Савецкай Беларусі. На гэтым яны будуюць сваю палітыку арганізацыі сіл супраць Савецкай улады, разумна маўчучы тым часам аб тым, што робіцца ў мэтах дэмакратычных дзяржаў, якія іх прытулілі. Зразумела, усе гэтыя варожыя нам групоўкі ніякіх уплываў на масы рабочых і сялян не маюць, а таму небяспекі для Саветаў не прадстаўляюць, і з імі прыходзіцца лічыцца толькі пастолькі, паколькі яны могуць быць скарыстаны

імперыялістамі рознай масці ў іх барацьбе супраць Савецкага Саюза. Нам здаецца, што жыццё і развіццё Савецкай Беларусі, самы факт існавання ўлады рабочых і сялян з'яўляецца лепшым аргументам у нашай барацьбе за аўладанне масамі. Як ні стараліся б нашы праціўнікі, колькі б арганізацый яны ні закладалі, якія б субсідыі ад сваіх апекуноў яны ні даставалі — ім не бачыць у сваіх ног працоўных Беларусі, як не ўгледзець і сваіх вушэй.

## Савецкая Беларусь і Савецкі Саюз

Савецкая Беларусь спакойна і пераканана глядзіць у будучыню. Яе адносіны да Савецкага Саюза і ўсіх Савецкіх Рэспублік будуюцца на грунце аховы ўзаемнага суверэнітэту, а таксама ўзаемнага падтрымання ў змаганні і будаўніцтве. Беларусь уваходзіць цяпер, таксама як увесь Савецкі Саюз, у такую паласу, калі яна ад працэсу аднаўлення павінна стаць на шлях шырокага сацыялістычнага будаўніцтва. Для забеспячэння поспеху гэтай работы зараз пастаўлена і вырашаецца пытанне аб эканамічным раёнаванні БССР, а таксама аб упарадкаванні эканамічна-нацыянальных граніц паміж БССР і РСФСР, што закранае тэрыторыі былых Віцебскай і Гомельскай губерняў. Гэтыя пытанні ва ўмовах буржуазнай дзяржаўнасці з'яўляюцца заклятымі, нераззвязнымі пытаннямі, а калі яны вырашаюцца, то толькі сілаю зброі. Ва ўмовах Савецкай дзяржавы гэтыя пытанні вырашаліся, вырашаюцца і будуць вырашацца на грунце ўважлівага і глыбокага вывучэння эканамічных і нацыянальна-культурных асаблівасцей Рэспублік, іх узаемных адносін, а таксама эканамічных, культурных і палітычных задач, якія стаяць перад намі. Гэтыя прынцыпы пакладзены таксама і ў грунт вырашэння пытання аб эканамічным раёнаванні БССР і забяспечваюць правільнае і мэтазгоднае вырашэнне гэтага важнейшага ў далейшым будаўніцтве Савецкай Беларусі пытання.

# За Савецкую Беларусь

## Прадмова

«За Савецкую Беларусь» ёсць спроба даць кароткі, канспектыўны агляд галоўных этапаў барацьбы за Савецкую Беларусь, а разам растлумачыць найбольш зразумела, чаму толькі шлях Савецкай улады, шлях дыктатуры пралетарыяту пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі з'яўляецца адзіна правільным і адзіна адпавядаючым інтарэсам рабочых і сялян Беларусі ў іх барацьбе за лепшую будучыню, за сацыялістычны парадак жыцця.

Увесь час, калі пісаў гэту кнігу, я думаў пра ўсіх тых рабочых, сялян, інтэлігентаў, разам з якімі мы пад кіраўніцтвам Кампартыі вядзём барацьбу за Савецкую Беларусь, будуем новае жыццё ў Савецкай Беларусі. Для іх напісана гэта кніга. У сваёй працы я шчыра жадаў быць зразумелым і карысным гэтым шырокім масам барацьбітоў і будаўнікоў Савецкай Беларусі.

На вялікі жаль, брак часу і матэрыялаў не даў магчымасці як след распрацаваць усе пытанні беларускай палітычнай сучаснасці.

Добра разумею гэты недахват і згаджаюся даць у друк кнігу толькі па настойлівых дамаганнях таварышаў, якія лічаць карысным яе надрукаванне нават у такім выглядзе.

Хацеў бы, каб на гэтым не скончылася праца над маёй кнігай.

Хацеў бы, каб кожны чытач, прагледзеўшы кнігу, запаліўся б жаданнем паправіць яе, палепшыць, дзеля чаго напісаў бы мне зусім шчыра і адкрыта аб усіх добрых і дрэнных баках кнігі, сказаў бы, што трэба дадаць, што трэба выкінуць.

Разам з рабочымі і сялянамі, разам з працоўнай інтэлігенцыяй мы творым новае сацыялістычнае жыццё, разам трэба пісаць і кнігу нашага жыцця.

У канцы лічу абавязковым шчыра падзякаваць т.т. Агурскага і Гэльтмана за правільныя заўвагі, на падставе якіх мною зроблены своечасова папраўкі і дадаткі.

Таксама дзякую т.т. Ігнаценка і У. Каліноўскаму за дапамогу ў збіранні і распрацоўцы матэрыялаў.

*А. Чарвякоў*

## На перагібе гісторыі

Мы ўсе добра ведаем, што гаспадарчае жыццё развіваецца ў залежнасці ад развіцця прадукцыйных вытворчых сіл. Разам з гэтым змяняецца эканамічны парадак, змяняюцца ўзаемаадносіны паміж людзьмі, змяняюцца палітычныя і праўныя формы жыцця, змяняецца і светагляд ды псіхічны склад чалавека. Аб гэтым Карл Маркс казаў: «На пэўнай ступені свайго развіцця вытворчыя сілы грамадзянства ўваходзяць у супярэчнасць з існуючымі ў гэтым грамадзянстве вытворчымі адносінамі ці, кажучы тое самае юрыдычнай мовай, з маёмаснымі адносінамі, унутры якіх яны дагэтуль развіваліся. З форм, дапамагаўшых развіццю вытворчых сіл, гэтыя адносіны робяцца перашкодай іх развіцця. Тады надыходзіць эпоха сацыялістычнай рэвалюцыі. Са зменай эканамічнай падставы змяняецца больш ці менш хутка ўся агромістая надбудова, што ўзвышаецца над ёй».

Калі мы прасочым за развіццём чалавечага жыцця, дык знойдзем яскравую падмогу гэтым словам. Гісторыя Беларусі таксама можа быць добрым прыкладам для вышэйсказанага.

У даўнейшыя часы гісторыі Беларусі, калі нашы прародзічы жылі племянным бытам, іх адносіны характарызаваліся асаблівасцямі родавага быту: род супольна ўладаў рухомай і нерухомай маёмасцю і кіраваўся сваім старшым у родзе: прадзед, дзед, старэйшы брат або старэйшы па выбару. Пастановы роду прымаліся на радавым сходзе — вечы.

Далейшае развіццё гаспадарчага жыцця Беларусі, пачынаючы з XII веку, адзначаецца значнымі ўплывамі гандлю, які ішоў з Усходу на Захад. Заняткамі галоўнай масы насельніцтва былі пушны або рамесніцкі промысел; але на паверхню жыцця выплываюць больш матэрыяльна дужыя, тыя, хто захапляе ў свае рукі гандаль, вылучаецца частка насельніцтва, якая верхаводзіць у гандлі.

На падставе свайго матэрыяльнага «пяршынства» гэтая частка насельніцтва, якая пачынае называцца баярамі або купцамі, трымае ў сваіх руках уладу, кіруе і камандуе на вечавых сходах, назначае і праганяе князёў ды г.д. Ужо ў гэтыя старадаўнія часы ёсць падзел насельніцтва на баяр, мяшчан і простых людзей, паміж якімі ўвесь час ідзе вострая барацьба.

Наступны перыяд прыйшоў разам са зменай матэрыяльнай падставы. Роля гандлю як асноўнай галіны гаспадарчага жыцця паступова пачала змяншацца, і на першы план высунуліся пазямельныя суадносіны: багацце і галеча, а разам з гэтым сіла або слабасць палітычная пачалі залежаць ад землеўладання.

Галоўнае багацце пачынае даваць зямля. Той, хто мае больш зямлі, мае больш багацця. Разам з гэтым і ўлада пераходзіць у рукі таго, хто ўладае найбольшымі зямельнымі абшарамі. Клас вялікіх землеўласнікаў мае старадаўняе прозвішча баяр, або зямлян, а потым прымае назву шляхты. Сялянства паступова траціць права на зямлю. У сялянства застаецца толькі права на свабоднае карыстанне сваёй працай. Але дужэйшы клас землеўласнікаў выкарыстаў сваю сілу і свае ўплывы, каб пазбавіць сялян нават права на свабоднае карыстанне сваёй працай.

Так узнікае прыгон.

Пераход зямлі да шляхты-дваранства даў у яе рукі ўсю дзяржаўную ўладу. Вышэйшая ўлада караля мела сілу і значэнне толькі да таго часу, пакуль кароль быў першым найбагацейшым землеўласнікам.

Разам са стратай сваёй зямельнай маёмасці каралеўская ўлада ў польска-літоўска-беларускай дзяржаве страціла ўсе свае правы і права дзейнасці.

Улада апынулася ў руках шляхты — феадалаў, якія ядналіся агульнымі інтарэсамі адзінай матэрыяльнай падставы — зямлі.

Сярод феадалаў-шляхты вызначылася 30—40 вяльможных радавітых паноў, якія з'яўляліся ўладарамі велізарнай часткі дзяржаўнай маёмасці, а разам з гэтым былі фактычнымі гаспадарамі ды ўладарамі дзяржавы. Да гэтых вяльможных паноў далучыліся меншыя паны; потым ішлі падпанкі і дробная шляхта. Хаця шляхта па стану сваёй гаспадаркі і жыцця вельмі падыходзіла да сялян, але яе зямельныя інтарэсы былі аднолькавыя з інтарэсамі вялікіх паноў як аднаго класа ўладароў зямлі ды ўдзельнікаў у дзяржаўнай уладзе супроць паднявольнага і бяспраўнага сялянства.

Гэты перыяд жыцця Беларусі носіць назву «феадалізму»[1].

Наступны перыяд у гаспадарчым развіцці адзначыўся скасаваннем прыгону.

Чаму быў скасаваны прыгон? Таму, што ў гаспадарчым жыцці Беларусі, як і ўсёй Расіі, надышлі змены. Раней інтарэсы землеўласніка і дзяржавы патрабавалі прымацавання селяніна

---

[1] Феадалізмам называецца такі лад, пры якім гаспадарчыя і дзяржаўнапраўныя суадносіны вызначаюцца зямельнымі суадносінамі, прычым уладар зямлі мае дзяржаўныя правы ў стасунку да тых, хто карыстаецца зямлёй.

да зямлі. Разам жа з вялікім узростам насельніцтва і прамысловасці прыгон рабіўся нявыгадным для развіцця капіталізму як новай, больш высокай формы грамадзянска-гаспадарчых узаемаадносін, пачаў затрымліваць гаспадарчае развіццё. Калі б царскі ўрад не выдаў закону аб скасаванні прыгону, дык прыгон усё роўна быў бы скасаваны рэвалюцыйна, бо ён ужо не толькі не адпавядаў, але, наадварот, супярэчыў інтарэсам гаспадарчага развіцця.

Увесь апошні перыяд гаспадарчае развіццё Беларусі і Расіі характарызуецца паступовым умацаваннем капіталістычных узаемаадносін, якія вялі безупынную барацьбу за пяршынства і паступова знішчалі перажыткі феадалізму як у гаспадарчым, так і ў палітычным жыцці. Узрастанне капіталізму паступова высоўвала на паверхню палітычнага жыцця новы клас — капіталістаў. У 1905 годзе прамысловая і гандлёвая буржуазія вельмі спачувала так званаму закону «17 октября». Гэты закон меў на ўвазе знішчыць старыя феадальныя перажыткі і расчыніць дарогу для прыходу да кіруючай палітычнай ролі новай капіталістычнай буржуазіі.

Толькі палітычная друзласць буржуазіі ды залежнасць яе ад дзяржаўных заказаў далі царскаму ўраду, у якім цар быў першым памешчыкам-феадалам, узяць назад закон «17 октября» і гэтым зноў прыпыніць знішчэнне перажыткаў феадалізму. Да апошніх дзён свайго існавання царызм з'яўляўся апірышчам так званага ваенна-феадальнага імперыялізму.

Наш кароткі і вельмі агульны прабег па гісторыі Беларусі дае досыць прыкладаў для падмацавання тае думкі, што ўзаемаадносіны між людзьмі ды класамі знаходзяцца ў залежнасці ад існуючага эканамічнага парадку.

Гісторыя другіх народаў магла б даць яшчэ большы лік больш выразных прыкладаў.

З гэтых усіх прыкладаў мы бачым, што эканамічны лад замяняецца адзін другім, больш нізкі — больш высокім. У адпаведнасці з гэтым кіраванне дзяржаўным і палітычным жыццём пераходзіць ад аднаго да другога. Паміж рознымі класамі на ўсім працягу гісторыі ідзе ўвесь час барацьба за пяршынства.

У «Камуністычным маніфесце» аб гэтым гаворыцца так: «Гісторыя кожнага існаваўшага дагэтуль (цывілізаванага) грамадзянства ёсць гісторыя класавай барацьбы... Вольны і нявольнік, патрыцый і плебей, пан і прыгонны, цэхавы майстар і чэлядзінец (падручны), карацей — прыгнятальнікі і прыгнечаныя — былі ў стане пастаяннай варажнечы паміж сабою, пачалі безупынную то патайную, то адкрытую барацьбу, якая кожны раз канчалася рэвалюцыйнай перабудовай усяго грамадскага ладу або супольнай гібеллю ваюючых класаў» («Кам. маніфест»).

Паспрабуем на падставе зазначаных намі законаў аб залежнасці ўзаемаадносін паміж людзьмі ды эканамічным ладам і закону класавай барацьбы высветліць агульны сэнс тых падзей, удзельнікамі якіх з'яўляемся мы, людзі сучаснасці.

У эканамічнай навуцы сучасны эканамічны лад перадавых краін носіць назву капіталізму, які мае свае асаблівасці ў параўнанні з папярэднім феадальным парадкам.

«Цяпер эканамічнае значэнне і багацце краю залежыць перш за ўсё ад капіталістычнай вялікай прамысловасці, якая служыць ужо не раскошы, а масавай прадукцыі прадметаў першай патрэбы» («Кам. маніфест»).

Разам з развіццём капіталістычнай прамысловасці, гандлю, чыгунак, плавання па моры расце, замацоўваецца і пашыраецца роля буржуазіі, якая паступова з узростам сваіх капіталаў адсоўвае на задні план усе класы, што перайшлі ў спадчыну ад мінулага.

Сама буржуазія ў залежнасці ад той ці іншай ступені свайго развіцця займала адпаведнае месца ў палітычным жыцці ды зменах. «Буржуазія была то станам, прыгнечаным уладай феадальнага пана, то ўзброенай супольнай камунаю[1] з самаспраўваннем: тут яна складае незалежную грамадскую рэспубліку, там з'яўляецца падатковым трэцім станам у манархічнай дзяржаве; потым, у часе мануфактурнага промыслу, была процівагай шляхецтву ў абсалютнай або абмежаванай манархіі і была галоўнай падвалінай вялікіх манархій наогул; з утварэннем вялікага промыслу і сусветнага рынку гэтая буржуазія заваявала сабе, нарэшце, поўнае палітычнае панаванне ў сучаснай канстытуцыйнай дзяржаве. Сучасная дзяржаўная ўлада (у буржуазных краінах) ёсць не што іншае, як камітэт па супольных справах усяго класа буржуазіі» («Кам. маніфест»).

Гэтыя словы былі сказаны больш 70 год таму назад. Ужо тады было адзначана, што буржуазія адыграла надзвычайную ролю ў развіцці вытворчых сіл. Тыя сілы, што драмалі ў нетрах грамадскай працы і што не маглі выявіцца ў папярэдні перыяд феадалізму, атрымалі магчымасці для свайго вызвалення ды развіцця. Апанаванне сіламі прыроды, увядзенне машыннага спосабу прадукцыі, дапасаванне хіміі да патрэб прамысловасці і земляробства, пабудаванне параходаў, чыгунак, электрычных тэлеграфаў і г.д., і г.д. — вось усё тое, што дало грамадству панаванне буржуазіі.

---

[1]Так называлася ў італійскіх і французскіх гарадах гарадская грамада пасля таго, як мяшчане выкупілі або адваявалі ад сваіх феадальных паноў першае права на самаспраўванне.

Увесь папярэдні перыяд часоў перад Вялікай сусветнай вайной быў працягам далейшага развіцця капіталізму. Капіталізм пераходзіць на новую, вышэйшую ступень — імперыялізм. Адбываецца аб'яднанне капіталістаў дзеля канцэнтрацыі вытворчасці на вельмі высокай ступені яе развіцця — ідзе прыспешаны захват галоўных крыніц сыравіны, прычым гэтага ў першую чаргу дамагаюцца тыя прамыслоўцы вугальнай і жалезнай прамысловасці, што ўжо аб'ядналіся. Буржуазія дзеліць паміж сабой вугаль, нафту, жалеза. «Хто ўладае нафтай, той уладае светам» — робіцца лозунгам дня капіталістычных узаемаадносін. Ідзе аб'яднанне банкаў.

Можна падаць шэраг прыкладаў, як некалькі банкаў перадавых капіталістычных краін, аб'яднаўшыся, сабралі міліярды і мільёны, што фактычна дае ў іх рукі большасць капіталаў той ці іншай краіны.

Нарэшце, ідзе барацьба за аб'яднанне ў нямногіх руках уладання калоніямі. Раней капіталізм меў магчымасць развівацца вольна, бо яму было шмат прасторы. Але па меры свайго развіцця, па меры падзелу багацця зрабілася патрэбным яднацца — манапалізавацца, каб забяспечваць у барацьбе за пяршынства, за багацце перамогу больш дужэйшым групам капіталістаў. Гэта палітыка манапалістычнага капіталізму і ёсць імперыялізм.

Пераход да імперыялізму прынёс новыя дасягненні ў развіцці вытворчых сіл, а разам з гэтым далейшае замацаванне ўлады буржуазіі.

Аднак сучаснае буржуазна-капіталістычнае грамадства не знішчыла класавай барацьбы. Яно толькі паставіла на пярэдні план новыя класы, прынесла новыя формы прыгнечання і класавай барацьбы. Буржуазнае грамадства спрасціла класавыя супярэчнасці: «Усё грамадства штораз выразней і выразней распадаецца на два вялікія варожыя станы, на два вялікія, заўсёды спрэчныя паміж сабою класы: буржуазію і пралетарыят» («Кам. маніфест»).

Разам з ростам буржуазіі расце пралетарыят. Гэта значыць, павялічваюцца масы тых людзей, што прадаюць сваю сілу капіталістам, працуючы на прадпрыемствах. Каб панаваць над рабочымі, капіталісты вымушаны забяспечыць ім тыя ўмовы, у якіх яны маглі б цягнуць сваё, хаця і паднявольнае, існаванне. Але мы бачым, што гэтага капіталізм і яго вышэйшая ступень — імперыялізм ужо не даюць. Досыць у якасці прыкладу прывесці ўзрост на ўсім свеце дарагоўлі і агульнага зніжэння матэрыяльнага стану працоўных. Тыя супярэчнасці, што ўвесь час існавалі паміж буржуазіяй і пралетарыямі, павялічваюцца і абвастраюцца. Праца рабочага на капіталістычным прадпрыемстве забяспечана толькі да таго часу, пакуль гэта дае прыбытак

капіталісту, пакуль заработная плата забяспечвае рабочаму сродкі на пражыццё.

Такім чынам, імперыялізм, разам з новымі дасягненнямі ў развіцці вытворчых сіл, яшчэ больш абвастрыў супярэчнасці паміж капіталістычнымі групамі, з аднаго боку, і паміж капіталістамі ды пралетарыямі, з другога боку.

«Усё гэта, — кажа У.І. Ленін, — спарадзіла тыя асобныя рысы імперыялізму, што прымушаюць характарызаваць яго як загніваючы або паразітычны капіталізм».

Значыць, сучасны момант гістарычнага жыцця, адзначаны надзвычайным развіццём імперыялістычных адносін, з'яўляецца разам з гэтым момантам загнівання, распаду капіталізму, заменай капіталістычных адносін новым, больш высокім грамадска-эканамічным укладам.

«Буржуазія не можа панаваць, бо яна няздольна забяспечыць свайму нявольніку пражыцця, нават у межах яго нявольніцтва, бо яна прымушана дапусціць заняпад яго да таго стану, у якім яна павінна карміць яго замест таго, каб ён карміў яе. Грамадства не можа далей жыць пад яе панаваннем, іначай кажучы, — жыццё буржуазіі не можа быць пагоджана з жыццём грамадства» («Кам. маніфест»).

На цяперашняй ступені свайго існавання прадукцыйныя сілы сучаснага грамадства ўвайшлі ў супярэчнасць з існуючымі ў гэтым грамадстве маёмаснымі адносінамі... З форм, дапамагаўшых развіццю вытворчых (прадукцыйных) сіл, гэтыя адносіны робяцца перашкодай іхняму развіццю.

Чалавечае жыццё апынулася, такім чынам, перад магчымасцю або далейшага пераходу на больш высокую ступень грамадска-эканамічных суадносін, якая задаволіць патрэбы ўсіх людзей, або перад магчымасцю, пры захаванні існуючага ладу, заняпаду.

Паўстала пытанне аб тым, на якіх падставах трэба ў далейшым будаваць жыццё, каб перайсці ў вышэйшую ступень, хто, які клас здолее ўзяць на сябе спадчыну капіталістычнай буржуазіі, каб забяспечыць гэты пераход.

Усе папярэднія класы, якія здабывалі сабе панаванне, імкнуліся забяспечыць сабе сваё панаванне тым, што падпарадкавалі ўсё грамадства інтарэсам сваёй нажывы. Прыватная маёмасць — вось што было непарушнай святыняй пануючых класаў. Але, як мы бачым, гэтая ж прыватная маёмасць з'явілася падставай для зараджэння, умацавання ды развіцця капіталістычных узаемаадносін і давяла да сучасных супярэчнасцей, пагражаючы самому існаванню чалавечага жыцця. Далейшае развіццё чалавечага жыцця на гэтай падставе ісці не можа.

Далейшае развіццё можа пайсці толькі па шляху знішчэння прыватнай маёмасці, прыватнага прыўлашчэння і ўсіх ранейшых спосабаў прыватнага забеспячэння — гэта значыць па шляху да камунізму.

Буржуазія перастала быць класам, верхаводства якога забяспечвала паступовае развіццё вытворчых сіл. Яна павінна ўступіць месца новаму класу. З усіх класаў, варожых буржуазіі, толькі пралетарыят безупынна і няўхільна імкнецца да сацыяльнага прагрэсу. Толькі пралетарыят з'яўляецца сапраўды рэвалюцыйным класам. «Усе іншыя класы занепадаюць і гінуць пад уплывам вялікай прамысловасці, а пралетарыят якраз наадварот — ён расце і дужэе з развіццём прамысловасці» («Камуністычны маніфест»).

Такім чынам, мы бачым, што капіталістычны свет няўхільна ўвайшоў у паласу сацыялістычнай рэвалюцыі. Нам трэба цяпер знайсці адказ на два запытанні: першае — які размах, якую тэрыторыю і якія дзяржавы павінна ачапіць сацыялістычная рэвалюцыя, і другое — дзе яна павінна пачацца?

«Раней, — адказвае т. Сталін на першае запытанне аб размаху рэвалюцыі, — звычайна было гаварыць аб пралетарскай рэвалюцыі ў той ці іншай развітай краіне як аб самастойнай значнасці, якая стаіць супраць асобнага нацыянальнага фронту капіталу як свайго «антыподу». Цяпер гэтага ўжо мала. Цяпер трэба гаварыць аб сусветнай пралетарскай рэвалюцыі, бо паасобныя нацыянальныя франты капіталу перайшлі ў звенні адзінага ланцуга, які называецца сусветным фронтам імперыялізму і якому павінен быць процістаўлены агульны фронт рэвалюцыйнага руху ўсіх краін».

Значыцца, пралетарская рэвалюцыя не можа абмежавацца межамі толькі адной дзяржавы. Яна павінна ахапіць увесь свет, бо цяпер няма паасобнай нацыянальнай гаспадаркі, а ёсць адзіная сусветная гаспадарка. Пралетарская рэвалюцыя з'яўляецца вынікам развіцця супярэчнасцей у сусветнай сістэме імперыялізму, вынікам разрыву ў той ці іншай краіне агульнага ланцуга імперыялістычнага фронту.

Дзе павінна пачацца ў першую чаргу рэвалюцыя? Зусім памылкова будзе, калі мы для адказу на гэта запытанне паспрабуем разбіраць паасобку кожную краіну і даходзіць, прыйшоў ці не прыйшоў час сацыялістычнай рэвалюцыі ў залежнасці ад ступені развіцця прадукцыйных сіл данай дзяржавы. А тым часам так звычайна і адказваюць: рэвалюцыя пачынаецца там, «дзе больш развіта прамысловасць, дзе пралетарыят складае большасць, дзе большыя культурнасці, дзе большая дэмакратыя». Так, напрыклад, памылкова казаў вядомы тэарэтык марксізму Пляханаў. Ленінская ж тэорыя рэвалюцыі на гэта запытанне адказвае так: «Не, неабавязкова там, дзе прамысловасць больш

развілася і г.д. Фронт капіталу прарвецца там, дзе ланцуг імперыялізму слабейшы, бо пралетарская рэвалюцыя ёсць вынік разрыву ланцуга сусветнага імперыялістычнага фронту ў самым слабым яго месцы, прычым можа здарыцца, што краіна, пачаўшая рэвалюцыю, краіна, прарваўшая фронт капіталу, з'яўляецца менш развітай з капіталістычнага боку, як другія, больш развітыя краіны, якія застаюцца, аднак, у рамках капіталізму» (Сталін).

У 1917 годзе царская Расія з'явілася найбольш слабым звяном капіталістычнага ланцуга. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі расійская буржуазія не мела сілы ўтрымаць уладу ў сваіх руках. Буржуазная Лютаўская рэвалюцыя перайшла ў Пралетарскую Кастрычніцкую. Сусветная пралетарская рэвалюцыя пачалася ў Расіі. Чаму? «Таму, што ў Расіі пачыналася агромістая народная рэвалюцыя, на чале якой ішоў рэвалюцыйны пралетарыят, маючы такога сур'ёзнага хаўрусніка, як многамільённае сялянства, прыгнечанае і эксплуатаванае памешчыкамі. Таму, што супраць рэвалюцыі стаяў там такі брыдкі прадстаўнік імперыялізму, як царызм, не маючы жаднага маральнага ўплыву». І таму, хаця Расія з боку вытворчых сіл стаяла далёка ніжэй, як Францыя, Англія і г.д., аднак у ёй першай пачалася сацыяльная рэвалюцыя.

Гэтаксама будзе і далей. Імперыялістычны фронт будзе паступова прарывацца ў найбольш слабых сваіх месцах, там, дзе не толькі пралетарыят здолее ўзяць у свае рукі кіраўніцтва, але і там, дзе буржуазія страціць магчымасць утрымліваць кіраванне дзяржаўным жыццём у сваіх руках.

Такім чынам, Расійскую Кастрычніцкую рэвалюцыю трэба разглядаць як пачатак сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Сутнасць Кастрычніцкай рэвалюцыі ў тым, што яна дала ўладу ў рукі пралетарыяту і тым забяспечыла перамогу сацыялізму праз безупыннае сацыялістычнае будаўніцтва. Кастрычніцкая рэвалюцыя, перадаўшы ўладу ў рукі пралетарыяту, гэтым самым дала магчымасць пралетарыяту разам з агромістымі масамі бяднейшага і сярэдняга сялянства будаваць сацыялістычныя адносіны ў нашай краіне, з'яўляючыся ў той жа час дапамогай пралетарыяту іншых краін у іхняй барацьбе з сусветным імперыялізмам. У свой час, калі пралетарыят іншых краін падолее сваю буржуазію і праз рэвалюцыю захопіць уладу ў свае рукі, наша праца па будаўніцтву сацыялізму пойдзе ўперад больш шпарка.

Чалавечае грамадства ў бягучы момант знаходзіцца на пераломе сваёй гісторыі, у паласе сусветнай Кастрычніцкай рэвалюцыі, пачатак якой палажыла Кастрычніцкая рэвалюцыя ў б. Расіі.

Сусветны Кастрычнік — вось сэнс тых рэвалюцыйных падзей, сведкамі і ўдзельнікамі якіх з'яўляемся мы, людзі сучаснасці.

## Беларусь перад Кастрычніцкай рэвалюцыяй

Афіцыяльна Беларусі перад рэвалюцыяй не было, а быў «Северо-Западный край» Расійскай імперыі. Праўда, урачыстыя маніфесты цара, якія звычайна пачыналіся пералікам яго тытулаў, мелі заўжды прызнанне, што «цар маскоўскі» ёсць таксама і «вялікі князь літоўскі». Але гэта было толькі для ўрачыстасці, каб выклікаць большую павагу да цара па-за межамі Расійскай імперыі. Сапраўды ж усё тое, што так ці інакш гаварыла аб былой гісторыі Беларусі, што так ці інакш магло напамінаць, што Беларусь — гэта не ёсць Расія, — усё гэта нішчылася, праследавалася, выпальвалася агнём ды жалезам.

Царскі ўрад, захапіўшы ў свае рукі Беларусь пасля падзелу Польшчы, упэўніў сябе і стараўся ўпэўніць другіх, што Беларусь ёсць «ісціна рускі» край. Гора было таму, хто з гэтым не згаджаўся і думаў інакш.

Гістарычныя падзеі ў Беларусі за апошні век унеслі ў жыццё страшэнную блытаніну. Простаму чалавеку было вельмі цяжка разабрацца ва ўсіх хітрыках пануючых класаў. Да таго ж стан большасці сялянства, а таксама жыхароў горада і мястэчак — рабочых, гаматужнікаў, рамеснікаў — быў надзвычайна цяжкі з матэрыяльнага боку, бяспраўны і паднявольны.

Беларусь была далучана да Расіі ў тыя часы, калі Польшча знаходзілася ў эканамічным, палітычным і культурным заняпадзе. Польскае панства — шляхта, асабліва яе вяльможная частка, трацілася на шыкарнае жыццё, выціскаючы на гэта апошнія сокі з сялянства. Сялянства знаходзілася ў стане поўнага заняпаду, бо пан быў не толькі гаспадаром, на якога працаваў прыгонны селянін, але ён быў таксама і гаспадаром жыцця і смерці свайго хлопа — прыгоннага. Царскі ўрад пасля далучэння Беларусі да Расіі пастараўся выкарыстаць цяжкае становішча сялян: каб паслабіць уплывы польскага панства ў Беларусі, цар і яго губернатары зрабілі выгляд, што яны не спачуваюць адносінам паноў да сялянства і клапоцяцца аб долі селяніна. Напрыклад, царскі ўрад яшчэ задоўга да агульнарасійскага закону аб скасаванні прыгону прапанаваў панам на Беларусі «добраахвотна» адмовіцца ад прыгону. Прыгон, як вядома, быў скасаваны ў 1861 годзе маніфестам цара. Большасць панства была procіў гэтага і доўгі час не хацела выконваць гэтага закону. Мой дзед апавядаў, што яго пан пасля агалашэння маніфесту 1861 г. сабраў сваіх хлопаў у

царкве і казаў: «Дурні будзеце, калі паслухаеце маніфесту, з голаду падохнеце без пана. Ведайце, што гэты закон усё роўна скасуюць, і дрэнна будзе потым таму, хто паслухае закону і кіне адбываць паншчыну». І, паводле слоў дзеда-ткача, у панскім двары з усёй грамады народу ён толькі адзін адважыўся сказаць пану, што больш на паншчыну не пойдзе.

Значыць, абставіны складваліся так, што цар выходзіў абаронцам сялян. Адсюль выходзіла і тая думка, што паляпшэнне стану гаротнага сялянства ідзе з Расіі і што, наадварот, усё тое, што вядзе барацьбу супраць Расіі, накіравана супраць інтарэсаў сялян. Гэту думку царскі ўрад стараўся ўсялякім спосабам пашырыць і замацаваць. Каб паслабіць матэрыяльнае становішча польскага панства, царскі ўрад канфіскаваў панскую зямлю і раздаваў яе часткай сваім чыноўнікам, а часткай беднейшаму сялянству, быўшым дварным і г.д. Царскі ўрад, каб звязаць рукі панству, заводзіў так званае сервітутнае землекарыстанне, пры якім інтарэсы селяніна сустракаліся з інтарэсамі землеўласніка. І ў той час, як землеўласнік імкнуўся знішчыць сервітут, царскі ўрад зноў выступаў як абаронца сялян, абараняючы для сялян гэтыя сервітуты. І таму, калі ў 1863 годзе пачалося новае паўстанне на землях былой Польшчы, а гэта значыць і ў Беларусі, дык яно ўжо не мела такога размаху, як у 1831 годзе. Царскі ўрад кінуў думку ў сялянскія масы, што гэта ёсць паўстанне паноў, якія хочуць вярнуць прыгон, што, ведучы барацьбу супраць прыгону, царскі ўрад вядзе барацьбу дзеля абароны сялянства ад паноў. Такія думкі знаходзілі сабе глебу сярод сялянства і мелі значны ўплыў на сялянскія настроі. Гэта можна падмацаваць прыкладамі нават з найноўшых часоў. Вядомы польскі буржуазны дзеяч Станіслаў Грабскі надрукаваў у 1923 годзе кнігу «Увагі да бягучай гістарычнай хвіліны Польшчы», дзе ён кажа так: «Урадавая дэмагогія... пакінула ў настроях і поглядах вёскі Каралеўства значныя сляды. Ёсць ваколіцы, дзе яшчэ нядаўна былі чутны ад старых сялян словы няверы ў Польшчу: «рускі нас выхаваў, рускі нас і пахавае».

Такім чынам, дзякуючы таму, што, з аднаго боку, становішча сялян Беларусі было вельмі цяжкае і што, з другога боку, царскі ўрад напружваў усе сілы, каб знішчыць усё нярускае, а ў першую чаргу найбольш культурна-палітычна свядомую польскую буржуазію, барацьба супраць польскага панства пераносілася наогул на барацьбу супраць Польшчы і ўсяго польскага, а барацьба за палепшанне долі селяніна зліваліся з барацьбой за Расію і за ўсё рускае. Царскі ўрад ішоў да сваёй мэты цвёрда і проста. Тых, хто не хацеў скарыцца, ён пасылаў на шыбеніцу або ў Сібір.

Уся палітыка царскага ўрада праводзілася для таго, каб замацаваць канчаткова Беларусь за Расіяй як «Северо-Западный Край».

Царскі ўрад трапна выкарыстоўваў настроі сялянства супраць панства ў барацьбе за замацаванне сваёй улады над Беларуссю.

Але ад гэтага сялянству не было лепей. Яно стагнала ад малазямелля, ад агульнага збяднення пасля прыгону, ад самаўладства адміністрацыі, ад некультурнасці, ад здзекаў над сваім жыццём, сваёй мовай, сваёй культурай. Фактычна клопаты царскага ўрада аб беларускай вёсцы абмяжоўваліся тым, каб даць замест польскага пана — расійскага. Вядомая палітыка Мураўёва ажыццяўлялася пад лозунгам: «Заваяваць Беларусь для Расіі расійскім самаварам». Гэта значыць шляхам каланізацыі Беларусі расійскімі элементамі. Царскі ўрад сурова абыходзіўся, сурова караў за ўсялякую праяву незадавальнення існуючым ладам ды імкнення да вызвалення ад уціску. Вядома, што ў 1863 годзе, калі на Беларусі ўтварыўся «Чырвоны жонд» пад старшынством Кастуся Каліноўскага для вызвалення беларускага сялянства ад панавання і польскіх і рускіх паноў, дык царскі ўрад вёў з ім барацьбу і як з супраціўнікам расійскага царызму, і як з класавым ворагам буржуазіі. Урад, які рабіў выгляд, што ён спачувае цяжкаму жыццю сялян, паслаў К. Каліноўскага на шыбеніцу.

Усё тое, што так ці іначай нагадвала аб Беларусі і яе гаротных жыхарах горада і вёскі, праследавалася, усіх тых, хто падымаўся на абарону матэрыяльнага становішча, а таксама нацыянальных, культурных асаблівасцей Беларусі, каралі або праганялі. Так, шыбеніцамі, царквой ды казармай царская Расія імкнулася знішчыць Беларусь як самабытную краіну.

З другога боку, Беларусь знаходзілася пад хвалямі польскіх уплываў. Польская нацыяналістычная буржуазія на Беларусі ў сваёй барацьбе за вызваленне Польшчы з-пад царскага ўладання імкнулася ўцягнуць ў гэту барацьбу і Беларусь. Беларусь, на думку паноў-абшарнікаў і наогул польскіх нацыяналістычных элементаў, гэта «Крэсы Усходнія» Польшчы, гэта Белапольшча, гэта спрадвечная польская краіна. Цар сваё права даводзіў шыбеніцай, катаргай, грашыма, «чынамі і ордэнамі», а польскія нацыяналісты нелегальна таксама імкнуліся даводзіць сваё. Памятаю такі выпадак з дзіцячых гадоў у Вільні, мне было гадоў 8 — 9. Прыходзяць да мяне таварышы і кажуць: «Ці не хочаш кожны дзень атрымліваць шклянку малака і булку з маслам?» Хто ж не хоча? Умовіліся, што заўтра пойдзем на пляцоўку, дзе гэта даюць. Адна толькі была ўмова: сказаць, што ты паляк, гаварыць толькі па-польску і, калі прыйдзе ксёндз, ды перажагнацца паводле каталіцкага абраду. І гэта было не выпадкова. Гэта была цэлая сістэма паступовага ўцягвання

арганізацыі баявога польскага нацыяналізму мясцовых элементаў.

Становішча заблытвалася тым, што ў барацьбу расійскага і польскага нацыяналізму ў Беларусі ўмяшалася рэлігійнае пытанне: праваслаўны — рускі, католік — паляк. Расійскі ўрад выкарыстоўваў праваслаўнае духавенства для барацьбы за ўплывы Расіі: польскі нацыяналізм, як вядома, на ўсім працягу свайго гістарычнага развіцця карыстаецца каталіцкім касцёлам дзеля сваіх інтарэсаў. Беларускае ж сялянства разбіралася па веры на 2 часткі — праваслаўных і католікаў — і ўцягвалася ў барацьбу расійскага ды польскага нацыяналізму.

Абодва бакі — і расійская і польская буржуазія, будучы варожымі адзін да другога, аднак сходзіліся і рабіліся хаўруснікамі ў барацьбе супраць працоўных Беларусі. Усякая думка аб тым, што Беларусь — гэта і не Польшча, і не Расія і што беларускае сялянства аднолькава непрыхільна да польскага і расійскага панства, варожа сустракалася як польскай, так і расійскай буржуазіяй. Расійскі нацыяналіст крычаў, што ідэі аб Беларусі паднімаюцца польскімі нацыяналістамі ў іх барацьбе супраць Расіі і што гэта ёсць «польская інтрыга». Польскія нацыяналісты, наадварот, паднімалі гоман, што гэта ёсць паход супраць польскасці ў Беларусі, што гэта ёсць «расійская інтрыга». Сапраўды ж абодва бакі баяліся з'яўлення такіх думак аб Беларусі, бо яны добра бачылі, што падставай для гэтых думак было паступовае нарастанне разумення працоўных, патрэбы барацьбы супраць панства і прыгнечання.

Разабрацца, як відаць, у складаных палітычных ды нацыянальных пытаннях беларускага жыцця простаму чалавеку было вельмі цяжка. Да ўсяго гэтага дамешвалася і яўрэйскае пытанне. Расійскі ўрад да далучэння Беларусі да Расіі не дазваляў жыць яўрэям у Расіі. Калі ж разам з далучэннем Беларусі ў склад жыхароў Расіі ўвайшлі і яўрэі, дык перад расійскім урадам паўстала пытанне, што рабіць з гэтым насельніцтвам? Яўрэі трымалі ў сваіх руках мясцовы гандаль і прамысловасць. Значыць, з гэтага боку яны былі карысны нават царызму, бо плацілі падаткі. Але, з другога боку, яўрэйскі капітал быў канкурэнтам для расійскага, і таму трэба было яго ўсялякімі спосабамі абмяжоўваць. І мы бачым, што расійскі ўрад усялякімі спосабамі імкнецца прыціснуць яўрэйскае насельніцтва. «Черта оседлости», працэнтная норма ў школах, забарона працаваць і карыстацца зямлёй, забарона працаваць на дзяржаўных пасадах, прымаць удзел у мясцовых самаўрадах — гэта і шмат што іншае, што прыходзіла ў галаву губернатарам, спраўнікам, земскім,ураднікам, стражнікам і г.д., з'яўлялася законам для яўрэйскага насельніцтва. Але ў гэтай барацьбе супраць яўрэяў удары фактычна траплялі ў яўрэй-

скую беднату, бо яўрэйская буржуазія купляла гільдыю, здабывала «почетное гражданство», дабівалася прафесій, якія выводзілі яе з гэтага зачараванага кола. Становішча ж яўрэйскай бедняты ад гэтага было яшчэ горшае, было немагчымае, даводзіла да вымірання яўрэйскага насельніцтва. А царскі ўрад імкнуўся выклікаць сярод беларускага ды іншага насельніцтва варожыя адносіны да яўрэяў. Ва ўсім ён стараўся вінаваціць яўрэя. Так выходзіла, што Беларусь паступова рабілася арэнай барацьбы розных нацыянальнасцей, што вельмі ахвотна падтрымліваў і чым вельмі хітра карыстаўся ўрад.

Такім чынам, калі перад рэвалюцыяй уся Расійская імперыя стагнала пад уціскам вайскова-бюракратычнага бота царызму, дык гэты стогн у Беларусі быў яшчэ горшы, як у Расіі.

Гаспадарчае становішча Беларусі было ўвесь час цяжкае. Пасля скасавання прыгону беларуская вёска, гарады і мястэчкі доўгі час не маглі ўстаць на ногі. Селянін атрымаў зямлю, але большая і лепшая частка яе засталася ў абшарні каў. На селяніна налажылі выкуп за зямлю па такой высокай ацэнцы, што селянін заплаціў і за зямлю, і за сябе, і за даўгі пана.

Жыць рабілася ўсё цяжэй. Пасля таго, як сялянская гаспадарка трохі падужэла, пачалося натуральнае выдзяленне ў ёй невялікага ліку багацейшых і велізарнай колькасці бяднейшых. Багацейшыя сяляне гатовы былі згадзіцца з царскімі расійскімі парадкамі, бо і ўрад імкнуўся дапамагаць багацейшым праз банкі, каб гэтым зрабіць багацейшых сваімі прыхільнікамі. Але бедната выйсця не мела. Досыць сказаць, што перасяленне ў Сібір толькі з чатырох губерняў — Магілёўскай, Менскай, Віцебскай і Смаленскай — за 20 год — з 1896 па 1915 — дало сёмую частку перасяленцаў з усёй Расіі.

Каб палепшыць сваё становішча, сялянства вяло барацьбу з панствам за зямлю, за павелічэнне свайго землекарыстання.

З кожным годам барацьба супраць панства рабілася ўсё вастрэйшай, даводзіла да непасрэднага наступу і захопу панскай зямлі. Але, з другога боку, гэта выклікала карныя вайсковыя, паліцэйскія ды іншыя экспедыцыі расійскай улады супраць сялянства. Сялянства паступова праходзіла школу барацьбы супраць буржуазіі, даходзіла да ўсведамлення, што расійскі царскі ўрад ёсць урад буржуазіі, што селяніну дабра чакаць ад гэтага ўрада няма чаго і што толькі праз знішчэнне царскага ўрада як абаронцы буржуазіі магчыма забяспечыць перамогу над панамі.

Гарады Беларусі раслі вельмі слаба. Працэнт гарадскога насельніцтва з 12,1 прац. у 1863 годзе знізіўся ў 1897 годзе да 11,5 прац., а перад вайной 1914 г. падняўся толькі да 13,4 прац.

Прамысловасць у Беларусі пачала развівацца позна: не было мясцовых капіталаў. Адыграла тут пэўную ролю і палітыка расійскай буржуазіі. У гэтыя часы польскі капітал і польская прамысловасць пачалі расці досыць хутка. Польская прамысловасць з'явілася канкурэнтам расійскай прамысловасці. Барацьба між польскім і расійскім капіталам выявілася на Беларусі ў тым, што яна затрымала і фактычна перашкаджала будаванню прамысловых прадпрыемстваў у Беларусі. Толькі ў Горадзеншчыну пасля паўстання 1831 года ў сувязі з павышэннем мытных падаткаў прабраўся польска-нямецкі капітал.

Зразумела, што лік рабочых у Беларусі быў нязначны і знаходзіўся ён у асабліва цяжкіх умовах жыцця. Слабасць гаспадарчага жыцця гарадоў і мястэчак выкідала на рынак працы значныя масы народу, вёска з свайго боку таксама давала вельмі танную сілу. Усё гэта выклікала надзвычайную канкурэнцыю сярод прапанаваўшых сваю працу і давала магчымасць іх страшэнна эксплуатаваць. Да гэтага далучалася і тое, што ў шэрагі рабочых уносілася атрута нацыянальнага і рэлігійнага фанатызму, што яшчэ больш іх аслабляла і ў яшчэ большай меры аддавала іх у рукі капіталістаў.

Але класавая самасвядомасць вельмі рана пачала ўмацоўвацца сярод працоўных Беларусі. На барацьбу за палепшанне свайго стану, на барацьбу за змену ўсяго сацыяльнага ўкладу і, у першую чаргу, за знішчэнне царызму пачалі заклікаць палітычныя рабочыя арганізацыі ў Беларусі, якія думкай аб інтэрнацыянальным аб'яднанні ўсіх рабочых адказвалі на імкненне буржуазіі выкарыстаць дзеля сваёй выгады рабочых, уцягнуўшы іх у нацыяналістычную барацьбу.

Значнае месца ў Беларусі займала рамесніцкая прамысловасць. Усіх рамеснікаў у Беларусі налічвалася ў 1913 годзе каля 200 тысяч чалавек. Роля рамесніцка-саматужнай прамысловасці ў агульным вырабе прадукцыі вельмі значная. Так, у 1913 годзе рамесніцкая прамысловасць дала 70,1 прац. усяго вырабу, тым часам як у Еўрапейскай Расіі яна займае толькі 23,8 прац.

Рамесніцкая прамысловасць складалася з беднаты, якой вельмі цяжка было забяспечыць сабе кавалак хлеба. У большасці сваёй рамеснікі — гэта бяспраўныя яўрэі, для якіх рамесніцтва з'яўлялася адзіным выйсцем і паратункам ад галоднай смерці. Не дзіва, што палітычныя рэвалюцыйныя рабочыя партыі Беларусі знаходзілі сярод рамеснікаў добры грунт для сваёй працы па арганізацыі сіл для наступу на царызм

Каб ахарактарызаваць агульны эканамічны стан Беларусі перад вайной, а разам з тым сказаць і аб матэрыяльным стане насельніцтва, падамо лічбы аб народным прыбытку Беларусі.

Малады беларускі вучоны Г. Гарэцкі дае гэткія лічбы народнага прыбытку на 1 чалавека ў рублях.

| Краіны | 1900 | 1913 | + % |
|---|---|---|---|
| Аўстралія | 374 | - | - |
| Злуч. Штаты | 346 | - | - |
| Злуч. Брытанскае Каралеўства | 273 | 463 | +70 |
| Францыя | 233 | 355 | +52 |
| Нямеччына | 184 | 292 | +59 |
| Аўстрыя | 127 | 287 | +80 |
| Італія | 104 | 230 | +109 |
| Балканскія дзяржавы | 101 | - | - |
| Еўрап. Расія | 62 | 101 | +51 |
| Беларусь | 54 | 83 | +55 |

Г. Гарэцкі кажа: «Прыбытак беларускага насельніцтва зусім мізэрны ў параўнанні з прыбыткам жыхароў Амерыкі ды Заходняй Еўропы, і з часам адносна іх ён робіцца яшчэ больш мізэрнейшым, бо ўзрост яго ніжэйшы, чым у замежных народаў».

*Культурны стан Беларусі таксама быў вельмі цяжкі.* На 1000 чал. насельніцтва ў 1914 годзе пісьменных прыпадала: на Еўрапейскай Расіі — 434, на Паўночным Каўказе — 356, на Украіне — 416 і на Беларусі — толькі 327. Пісьменных жа ў сельскіх мясцовасцях на 1000 душ насельніцтва налічвалася 276 разам з вучнямі. Гэта ў той час, як у некаторых заходне-еўрапейскіх дзяржавах непісьменных ужо няма або ёсць вельмі мала.

На фоне эканамічнага і культурнага заняпаду ды нацыяналістычнага змагання польскай, расійскай, яўрэйскай буржуазіі адна з другой і ўсіх іх разам супраць працоўных мас рабочых, рамеснікаў і сялян Беларусі панавала адміністрацыйнае, чыноўніцкае свавольства расійскага царскага ўраду.

Як відаць ужо з вышэйсказанага, на Беларусі меў ход толькі рускі, толькі праваслаўны. Беларус, паляк, яўрэй, наогул не рускі, а тым больш не праваслаўны не мог атрымаць нават невялікай пасады. Калі ж ішла справа аб вышэйшай пасадзе, дык і праваслаўны, але не рускі працаваць на Беларусі не мог.

Усім вядома, што нават на пасаду архірэя ў Беларусі прызначалі толькі рускіх. Калі ж беларус і канчаў духоўную акадэмію, дык яму трэба было служыць раней пэўны лік гадоў у Расіі, зарэкамендаваць сябе з «ісціна» рускага боку, і потым ужо можна было клапаціцца аб пасадзе ў Беларусі. На ўсе больш-менш адказныя пасады садзілі хоць і дурняў, але людзей стойкіх і верных «расійскаму прастолу і веры праваслаўнай». Не дзіва, што калі ў Беларусі быў недарод, голад, а ад гэтага і хваробы, дык адзін губернатар пісаў: «Беларускі селянін мае

дрэнную прывычку есці замест чыстага хлеба ўсялякую мешаніну з мякіны, крапівы, бульбы і г.д. Ад гэтага селянін і хварэе». Далей гэты мудры кіраўнік прапанаваў папярэдзіць сялян, каб яны елі толькі чысты хлеб, якога з прычыны недароду не было.

Мясцовы чалавек толькі ў тым выпадку дапускаўся да працы, калі ён даводзіў, што ён шчыра рускі і што ён веры праваслаўнай. Уся сістэма асветы ў Беларусі была прыстасавана, каб рабіць з «тутэйшых» — рускіх людзей і каб, прапусціўшы іх праз фільтр паліцэйска-царкоўнага дагляду, дапускаць на некаторыя пасады: школы, дробнае чыноўніцтва і г.д. для працы на карысць расійскаму прастолу.

Цікавіцца, як жыве насельніцтва Беларусі, што трэба, каб дапамагчы яму выйсці з цяжкіх абставін жыцця, каб, нарэшце, па-чалавечаму падняць дух працоўнага народа ў яго цяжкай барацьбе за паляпшэнне свайго матэрыяльнага і культурнага стану, не было каму з вышэйшых адміністратараў. Ды гэта і не трэба было. Пецярбургскае начальства вельмі крыва паглядзела б на такога адміністратара, які адважыўся б сказаць, што сучаснае кіраўніцтва на Беларусі не адпавядае ўмовам жыцця, інтарэсам ды імкненням насельніцтва Беларусі. Лепшым быў той з чыноўнікаў, хто лічбамі даводзіў, што ён ажыццяўляе «рускую» палітыку. Кожны год рабіліся справаздачы, што каталікі, іудзэі ды іншыя пераходзяць у праваслаўную веру, што мова ўрадавых, грамадзянскіх, прыватных устаноў руская, зямлю давалі ў першую чаргу расійскаму чыноўніку або «ісціна» рускім элементам з адстаўных салдат, засноўваліся саюзы рускіх людзей з усялякіх адкідаў, каб падносіць вернападданніцкія адрасы ды весці барацьбу з крамолай і г.д.

Усё, што магло гэтаму перашкаджаць, нішчылася. Беларуская мова была абвешчана выдумкай, неіснуючай, і карыстанне ёю было забаронена. Друк новых кніжак па-беларуску быў забаронены, а старыя нішчыліся.

Мовы польская, яўрэйская ды іншыя хаця і лічыліся існаваўшымі, але проста забараняліся. «Я сабачай мовы не разумею», — адказаў адзін выдатны віленскі чыноўнік, калі да яго звярнуліся па-польску з запытаннем.

На шчасце, трэба сказаць, што ўсё гэта было вельмі штучнае, не адпавядала патрэбам, сутнасці і напрамку жыцця, а таму плавала на паверхні і асаблівага ўплыву на масы народу не мела. Шырокія масы рабочых і сялян жылі самастойным жыццём і пад уціскам дзікага царскага самаўладства яшчэ хутчэй пачыналі выходзіць на шлях барацьбы за сваё эканамічнае і палітычнае вызваленне.

Цікава, што нават земскія начальнікі ў гэтыя часы характарызуюць стан і настроі вёскі вельмі сумнымі фарбамі. Беднасць, забітасць, цемната народу, недахват зямельнага надзелу, адсутнасць лесу, пашы. Панская эксплуатацыя пераходзіць усё магчымае, адносіны паноў да сялянства «дзікія». Адсюль агульнае незадавальненне, варожасць да заможных станаў. Вось што кажуць пра сябе сяляне, даючы наказ у першую Думу аб Віцебскай губ.: «Жыццё наша цяжкае... Калі пры такіх абставінах, як цяпер, працягнецца наша жыццё яшчэ 15 — 20 гадоў, дык мы будзем паміраць з голаду. Не кажучы ўжо пра багатых, нават у сярэдняга жыхара сабака не будзе есці таго, што павінны есці мы». Сяляне Смаленскай губ. кажуць: «Зямлі няма, лесу няма, пасвіць быдла няма дзе. Хлеба не хапае. Сяляне пападаюць у няволю. Селянін век працуе, а жыве ў брудзе, абадраны, непісьменны, і есці няма чаго. Школ няма. Закон абмяжоўвае правы сялян, пажаліцца няма каму». Не дзіва, што селянін пачаў дабівацца лепшай долі праз рэвалюцыйную барацьбу. Асабліва шырокае развіццё сялянскага руху ў Беларусі было ў 1905 — 7 гг.

Сялянскі рух ішоў па шляху зруйнавання панскіх двароў, знішчэння панскага дабра, раздзелу панскай зямлі. Гэты рух у большай сваёй частцы меў стыхійны, неарганізаваны характар. Але ўжо і ў той час былі спробы накіраваць сялянскі рух у адзінае рэчышча барацьбы супраць царызму.

«Арганізацыі РСДРП прымалі вялікі ўдзел у аграрным руху, маючы асобныя сялянскія арганізацыі» (Агурский. Очерки по истории КП(б)Б).

«Пры Віцебскай групе Паўночна-Зах. Камітэта яшчэ ў 1904 г. была сялянская с.-д. арганізацыя. У сакавіку 1905 года Полацкая арганізацыя выпусціла гектаграфаваны лісток «К крестьянам», які заклікаў да барацьбы з царскім урадам за сканчэнне вайны, скасаванне выкупаў, зварот абрэзкаў, вызваленне беднаты ад падаткаў ды інш.» (Мароховец).

«Менская група РСДРП на працягу ўсяго 1905 г. пасылала ў вёску агітатараў і прапагандыстаў і праз местачковыя арганізацыі распаўсюджвала ў вёсцы літаратуру, арганізоўвала мітынгі...» (Е. Беленькі).

«Пры Віленскім Камітэце ў 1905 годзе таксама была створана арганізацыя для працы ў вёсцы. У студзені 1906 г. у Вільні адбылася канферэнцыя, у якой прымалі ўдзел Віленская, Смаргонская, Гродзенская, Ашмянская і Лідская групы РСДРП» і на якой была прынята асобная рэзалюцыя аб працы на вёсцы (Агурский. Очерки по истории КП(б)Б).

Партыя бальшавікоў, такім чынам, ужо ў тыя часы ставіла пытанне аб патрэбе злучыць рабочых і сялян у адзінай барацьбе супраць царызму.

Побач з гэтым былі і такія арганізацыі, якія лічылі, што сялянская рэвалюцыя можа ісці зусім самастойным шляхам, дзеля чаго арганізавалі самастойныя сялянскія арганізацыі, чым рэвалюцыйны рух сялянскі фактычна проціставілі руху рабочаму.

Асабліва яскрава гэта вызначалася ў чыннасці партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў і Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

Беларуская Сацыялістычная Грамада, якая заснавалася пад уплывам Польскай Партыі Сацыялістычнай (ППС), імкнулася заняць на беларускай глебе тое месца, якое займала ППС у Польшчы. Гэта значыць, БСГ ставіла сваёй мэтай утварэнне нацыянальнай Беларускай дзяржавы, пасля чаго лічыла магчымым вырашаць сацыяльныя пытанні. Але змагацца за нацыянальную дзяржаву можна было, абапёршыся на захаваўшых нацыянальныя асаблівасці сялян. Каб выкарыстаць сялянства, трэба было мець поўную сялянскую праграму, і гэта праграма БСГ была вельмі радыкальная.

Такім чынам, паставіўшы перад сабою мэту ўтварэння Беларускай Дэмакратычнай Дзяржавы, БСГ радыкальнымі фразамі хацела прыцягнуць пад свае ўплывы ўсе незадаволеныя царызмам элементы, галоўным чынам сялянства.

Вось чаму ў часы рэвалюцыі 1905—6 года БСГрамада робіць крокі, каб арганізаваць сялянства. Дзеля гэтага склікаўся сялянскі з'езд Віленшчыны, быў арганізаваны «Мужычы саюз Міншчыны». Але праца БСГрамады наогул і імкненне да арганізацыі асобных сялянскіх саюзаў значных уплываў на сялянства не мелі.

Барацьба 1905—1907 года паказала беларускім сялянам, што толькі ў тым выпадку селянін дабіваўся свайго праз Думу, праз суды, праз непасрэдную барацьбу з панам, калі ён знаходзіў падтрыманне з боку рабочага, з боку рэвалюцыйных рабочых партый ды арганізацый. Рух сялянства гэтых гадоў мае значэнне таму, што ён, з аднаго боку, канчаткова паказаў селяніну, што без рашучых крокаў у барацьбе супраць буржуазіі выйсця з цяжкага становішча не будзе, і паставіў селяніна як клас супраць буржуазіі, а з другога боку, паказаў, што барацьба сялянства сама па сабе, без арганізуючай сілы, без правадыра значнай карысці не дасць.

Лік рабочых у пачатку развіцця беларускай прамысловасці быў нязначны, але рабочыя вызначаліся значным развіццём пачуцця годнасці і былі досыць арганізаваныя. Рэвалюцыйнасць рабочых Беларусі нарастала ў залежнасці ад цяжкага эканамічнага стану іх, так і таму, што значная частка рабочых былі яўрэі. Яўрэй знаходзіўся ў бязвыхадным стане: работы ў

Беларусі было мала, а выехаць за «черту оседлости» ён не меў права. Вось з гэтых прычын рабочы рух у Беларусі пачаўся вельмі рана.

Першыя стачкі рабочых адбыліся яшчэ ў 80-ых гадах. Так, у 1874 годзе ў Ландварове баставаў цвікова-драцяны завод, у 1877 годзе ткачы ў Беластоку з поспехам вялі барацьбу.

Палова дзевяностых гадоў адзначаецца значным уплывам забастовачнага руху. Забастоўкі былі ў Вільні, Менску, Віцебску, Горадні, Брэст-Літоўску, Гомелі і па ўсіх гарадах ды ў значным ліку мястэчак Беларусі. У 1892 годзе ў Вільні ўжо ўпершыню святкуецца 1-е мая.

Барацьба рабочых хутка набывае арганізаваныя формы. Ствараюцца партыйныя арганізацыі.

З 1893 г. у Заходняй Беларусі працавала Сацыял-Дэмакратычная Партыя Польшчы і Літвы, якая адразу стала на шлях рэвалюцыйнага марксізму.

Блізка што ў гэтыя ж гады пачала сваю працу Партыя Польскіх Сацыялістаў, якая ставіла галоўнай мэтай адраджэнне Польскай дзяржавы ў гістарычных межах, каб праз гэта мець магчымасць перайсці да сацыяльнай перабудовы. ППС распаўсюджвала свае нацыяналістычныя ўплывы не толькі сярод рабочых Польшчы, але і сярод рабочых Горадзеншчыны, Віленшчыны і Меншчыны.

У 1897 годзе ў Вільні на агульным з'ездзе яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый быў арганізаваны «Аб'яднаны Яўрэйскі Рабочы Саюз» (БУНД).

1-га сакавіка 1898 года ў Мінску заснавана Расійская Сацыял-Дэмакратычная Партыя, ад якой вядзе свой пачатак Бальшавіцкая Партыя.

Абставіны жыцця Беларусі з яе дробнай прамысловасцю, шырокім развіццём рамесніцкага і саматужнага промыслаў стварылі добрую глебу для ўмацавання мяшчанскіх і дробнабуржуазных настрояў ды імкненняў. Таму ў Беларусі значныя ўплывы мелі палітычныя партыі, якія адпавядалі гэтым настроям: БУНД, меншавіцкія партыі, народніцкія, нацыяналістычныя і г.д.

Царскі ўрад уважліва сачыў за развіццём рэвалюцыйнага руху і імкнуўся выкарыстаць усялякую магчымасць, каб яго разбіць, знішчыць. Яскравым прыкладам таго, як царскі ўрад хацеў выкарыстаць эканамічныя і нацыянальныя асаблівасці Беларусі для барацьбы з рэвалюцыяй, можа з'яўляцца так званая «зубатаўшчына» і палітыка царскага ўрада адносна сіяністскіх арганізацый.

Кіраўнік маскоўскай ахранкі Зубатаў так пісаў аб сваім плане барацьбы супраць рэвалюцыйных настрояў і барацьбы яўрэйскіх рабочых: «Трэба яўрэяў «огладить». Пасля гэтага з іх

можна шнуры віць. Дзякуючы іх аб'яднанасці маленькая да іх увага ўраз жа перадаецца ва ўсе куты, і пра гэта ведаюць усе. Распаліце натоўп (толпу) вашай увагай, маса пойдзе за вамі, а дзякуючы іх аб'яднанасці рэвалюцыянераў яны самі вам выдадуць з галавой...» (Агурскі. Нарысы па гісторыі КП(б)Б).

Зубатаў і Трэпаў дамагаліся, каб урад узяў у свае рукі клопаты аб некаторым паляпшэнні стану рабочых і праз гэта, папершае, зрабіў выгляд перад рабочымі масамі, што ён апякуецца аб рабочых, а па-другое, адбіць рабочых ад палітыкі. (Гл. падрабязна Агурскі: Нарысы па гісторыі КП(б)Б).

Прыхільнікі Зубатава ў Менску пачалі весці шырокую працу, і ў 1901 г. утварылі «Незалежную яўрэйскую рабочую партыю». Зубатаўшчыне ўдалося было на пэўны час дэмаралізаваць рабочы рух у Менску. У Вільні «незалежнікам» усталявацца не ўдалося.

Канчаткова вочы на сутнасць «зубатаўшчыны» адкрыў кішынёўскі пагром і загад аб забароне ўсіх легальных рабочых арганізацый.

Што да «сіянізму», дык той самы Зубатаў пісаў аб яго ролі так: «Трэба сіянізм падтрымаць і нагул сыграць на нацыяналістычных імкненнях... Мае прыяцелі (незалежнікі) кінулі палітыку і вянцом сваёй легальнай працы зрабілі нацыянальны ідэал. Ці не выйгрыш гэта для нас?» (Агурскі).

Аднак рабочыя ў Беларусі былі настроены рэвалюцыйна і, нягледзячы на ўсе закіды царызму ды яго прыхільнікаў, адкідалі заклікі да згоды з буржуазіяй. Пасля таго як сацыял-дэмакратычная партыя падзялілася ў 1903 годзе на бальшавікоў і меншавікоў, на Беларусі пачалі стварацца бальшавіцкія рэвалюцыйныя арганізацыі.

Рабочы клас Беларусі прайшоў добрую палітычную навуку. Усе моманты рэвалюцыйных выбухаў адзначаюцца стойкай барацьбой рабочых. Ахвяры рабочага класа замацавалі яе згоднасць ды арганізаванасць і забяспечылі ёй перамогу ў барацьбе.

Бальшавіцкая партыя вяла рабочых па пэўнаму шляху. Нягледзячы на тое, што лік сяброў бальшавікоў быў невялікі, нягледзячы на тое, што большасць свайго жыцця яны праводзілі ў турмах і высылках, іх уплывы на рэвалюцыйную барацьбу рабочых увесь час не знікалі. Уплывы бальшавікоў былі такія вялікія, што калі іншыя партыі хацелі весці рэвалюцыйную працу сярод рабочых, дык яны павінны былі пераймаць праграму, лозунгі і тактыку бальшавікоў. Вельмі рана, як сказана вышэй, пачалося збліжэнне рабочага рэвалюцыйнага руху з сялянскім. Першыя сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ўцягвалі ў свае шэрагі сялян, распаўсюджвалі па вёсках літаратуру, дапамагалі сялянам распрацоўваць патрабаванні да ўрада,

кіравалі барацьбой сялян з панамі ды адміністрацыяй. «Дэмакрат» — было вельмі знаёмае імя на вёсках Беларусі.

Рэвалюцыя 1905 года яшчэ больш замацавала гэту сувязь сялянскага і рабочага руху. Калі, з аднаго боку, селянін пачаў імкнуцца да таго, каб атрымаць раду, дапамогу, кіраўніцтва ад больш арганізаванага, больш свядомага рабочага, дык, з другога боку, рабочы бачыў стыхійны ўзрост сялянскага руху, бачыў, як пад ударамі сялянства дрыжыць царскае самаўладства, бачыў у селяніне свайго хаўрусніка, падарожніка і таму імкнуўся дапамагчы сялянам у іхняй барацьбе, увесці сялянскую барацьбу ў арганізаванае рэчышча, звязаць барацьбу сялян за свае інтарэсы з агульнапралетарскай барацьбой за перабудову грамадства на новых сацыялістычных падставах.

Апошнія гады перад вайной адзначыліся ў Беларусі страшэнным разгромам усіх рэвалюцыйных арганізацый. Але чым больш быў уціск царызму, тым большыя рэвалюцыйныя сілы і настроі нарасталі сярод рабочых ды сялян Беларусі, тым з большым выбухам яны збіраліся прарвацца на барацьбу супраць царскага самаўладства.

## Кастрычнік на Беларусі

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Перад Лютаўскай рэвалюцыяй 1917 года сярод усіх грамадскіх колаў Расіі адчувалася вялікае незадаволенне.

Дваранства і генералітэт лічылі цара Мікалая II за няздольнага, няўдалага і марылі, каб на месца Мікалая II паставіць лепшага ды больш разумнага цара.

Буйная гандлёва-прамысловая буржуазія марыла, каб знішчыць усе перашкоды з боку царскага вайскова-бюракратычнага апарату, якія заміналі ёй свабодна развіваць гандаль і прамысловасць, марыла, каб іграць пераважную ролю ў жыцці новай Расіі незалежна ад таго, будзе гэта Расія царская канстытуцыйная манархія ці буржуазна-дэмакратычная рэспубліка.

Рабочыя лічылі момант вайны найлепшым для пачатку рэвалюцыі, якая несла знішчэнне царызму як першай і галоўнай сілы, абараняючай буржуазны лад.

Нарэшце, сялянства жадала канца вайны і таксама лічыла, што пасля сканчэння вайны ўдасца прагнаць абшарнікаў ды забраць іхнюю зямлю.

Усе настроі ды імкненні таго часу можна падзяліць на дзве часткі: па-першае, настроі ды імкненні буржуазіі — абшарнікаў, дваранства, генералітэту, прамыслоўцаў, банкіраў, папоў, якія імкнуліся ўмацаваць буржуазны лад, зрабіць яго лепшым, мацнейшым; па-другое, настроі ды імкненні рабочых і сялян, якія

лічылі, што толькі рэвалюцыя дасць перамогу ў барацьбе з буржуазіяй за ажыццяўленне сваіх спрадвечных жаданняў.

Паміж гэтымі дзвюма асноўнымі групамі было шмат міжкласавых груп, якія імкнуліся знайсці сярэднюю пазіцыю, каб памірыць буржуазію з працоўнымі, але якія фактычна былі на баку буржуазіі, бо яны не станавіліся на бок работніцка-сялянскіх мас.

Беларусь сустрэла Лютаўскую рэвалюцыю ў страшэнным занападзе. Імперыялістычная вайна падзяліла Беларусь расійска-нямецкім франтам на дзве часткі. У Заходняй Беларусі гаспадарылі нямецкія акупанты, Усходняя Беларусь знаходзілася цалкам у паласе фронту расійскай арміі.

Насельніцтва Беларусі перажывала часы страшэннага прыгнечання, здзеку і агульнага заняпаду.

Гарады, вёскі, мястэчкі Беларусі былі ў значнай меры зруйнаваны. Сялян царызм высяляў у Расію, каб паказаць усяму свету, што народ выязджае з Беларусі, бо не хоча застацца з нямецкімі акупантамі; яўрэяў высялялі, бо царскі ўрад, каб скінуць віну за свае няўдачы з сваіх плеч, распаўсюджваў думкі, што яўрэі прадаюць немцам расійскую армію, шпіёняць, перавозяць праз фронт золата і г.д.

Усё гэта, разам узятае, давяло, кажа т. Кнорын у сваёй кніжцы «1917 год в Белоруссии и на Западном фронте», па-першае, да поўнага падрыву сілы рабочага класа ў краіне, да распылення яго асноўных і найбольш свядомых кадраў і да фактычнай ліквідацыі ўсіх рэвалюцыйных і сацыялістычных рабочых арганізацый краіны; па-другое, да распылення сялянства і нацыяналістычнай сялянскай інтэлігенцыі, якая ішла на чале беларускага нацыянальнага руху, і да падрыву і дэзарганізацыі самога беларускага нацыянальнага руху ды яго найбольш яскравых і левых «праяў».

У першыя ж дні пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў Беларусі пачалася барацьба за тое, па якому шляху павінна пайсці далейшае развіццё рэвалюцыі: сацыялістычнаму або буржуазна-дэмакратычнаму.

Невялічкая група бальшавікоў з т.п. Мясніковым, Кнорыным ды іншымі на чале, якая апынулася ў шэрагах арміі на Заходнім фронце, узяла на сябе ініцыятыву па барацьбе за сацыялістычную рэвалюцыю.

Паступова бальшавіцкая арганізацыя пачала расці: у яе шэрагі пачалі ўваходзіць салдаты фронту, а таксама рэвалюцыйныя беларускія рабочыя ды сяляне. 4 сакавіка 1917 г. арганізаваўся Менскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, які ўзяў на сябе цяжар збірання сіл, падрыхтоўкі да барацьбы за захапленне ўлады ў рукі рабочых і сялян. 15 сакавіка

арганізаваўся Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў у Віцебску. У красавіку быў скліканы З'езд сялянскіх дэпутатаў.

20 красавіка франтавы З'езд салдацкіх дэпутатаў вылучыў выканаўчы камітэт Заходняга фронту для арганізацыі, кантролю і кіравання жыццём Заходняга фронту. Нарэшце, 19, 20 і 21 лістапада адбыўся З'езд рабочых і сялянскіх дэпутатаў з усіх беларускіх губерняў. Ён паставіў перад дэлегатамі вострыя пытанні аб вайне, аб уладзе, аб зямлі. Па ўсіх гэтых пытаннях З'езд вынес пэўныя пастановы: вайну скончыць, уладу ўзяць у рукі рабочых ды сялян, зямлю перадаць сялянству. Так паступова ішла арганізацыйная праца бальшавікоў. Бальшавікі звярнулі сваю ўвагу, галоўным чынам, на салдат, рабочых, сялян, самі сталі і буйнымі крокамі вялі да захаплення ўлады працоўнымі.

У гэты час буржуазныя элементы Беларусі стараліся стрымаць няўхільнае імкненне рабочых, сялян і салдат да сацыялістычнай рэвалюцыі.

Арганізацыя супраць рэвалюцыйных сіл ішла каля двух цэнтраў: першы адбіваў настроі ды імкненне расійскай і зрусіфікаванай буржуазіі і меў сваімі абаронцамі дробна буржуазныя, мяшчанскія, інтэлігенцкія і сацыял-згодніцкія зрусіфікаваныя элементы; ён хацеў захаваць Беларусь як «Северо-Западный край» новай дэмакратычнай Расіі, ён імкнуўся пры дапамозе каманднага складу Заходняга фронту наладзіць у Беларусі «дэмакратычны» парадак, каб забяспечыць працяг вайны да «победного конца», адкладваючы вырашэнне ўсіх пытанняў аб уладзе, зямлі і г.д. да склікання Усерасійскага Устаноўчага Збору.

Да прыхільнікаў гэтага напрамку трэба аднесці гарадскія думы, земствы, партыі расійскіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў, расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў), БУНД і г.д.

Але нават ужо ў першыя дні рэвалюцыі гэта быў штаб без арміі. Камісары Часовага Ураду Керанскага, «дэмакратычныя» думы, земствы жаданага ўплыву на масы не мелі. Каму трэба было зрабіць справу, той ішоў у Савет. Таксама і сацыял-згодніцкія партыі трацілі сваіх сяброў, заставаліся пры камітэтах без сяброў, бо рэвалюцыйны элемент з гэтых партый ішоў да бальшавікоў.

Другім асяродкам, дзе збіраліся сілы супраць пралетарскай рэвалюцыі, з'явіўся беларускі нацыянальны цэнтр.

У першыя дні пасля Лютаўскай рэвалюцыі беларускія нацыяналістычныя элементы не мелі пэўнай платформы. Сабраўшыся ў сакавіку 1917 г., беларускія арганізацыі абралі Беларускі Нацыянальны Камітэт, у склад якога ўваходзілі абшарнік Скірмунт, ксёндз Гадлеўскі, землеўласнік Кастравіцкі, інтэлігенты, чыноўнікі, настаўнікі.

Беларускі Нацыянальны Камітэт у сваёй пастанове прызнаў «найлепшай формай дзяржаўнага ладу Расіі Фэдэрацыйна-дэмакратычную рэспубліку», заявіў, што «зямельная справа будзе развязана на Устаноўчым Расійскім Сойме»... патрабаваў «далучэння ўсёй Беларусі да дэмакратычнай Расіі»... і дабіваўся «нацыяналізацыі школы»...

Гэта была звычайная буржуазна-дэмакратычная платформа з некаторым нацыянальным адценнем.

Арганізацыя беларускага нацыянальнага цэнтра сама па сабе пашкодзіць рэвалюцыі не магла, бо як склад Камітэта, так і яго платформа адразу гаварылі рабочым і сялянам Беларусі аб яго класавай сутнасці. Але небяспекай было:

1) Тое, што Камітэт адразу заявіў, што ён абараняе агульнабеларускія інтарэсы і з'яўляецца прадстаўніком усяго Беларускага народу, ад імя каторага ён усюль пачаў рабіць заявы. Скірмунт, напр., падаваў ураду Керанскага дэкларацыю ад імя Беларускага народу.

2) Тое, што існаваўшыя ў Беларусі агульна-расійскія буржуазна-дэмакратычныя арганізацыі вялі і пасля рэвалюцыі старую ісціна рускую палітыку ў Беларусі, лічылі Беларусь за «Северо-Западный край». Вось гэта давала ў рукі Беларускага Камітэта козыр, бо ён мог паказваць на нібы рэвалюцыйныя расійскія элементы і гаварыць, што пакуль беларус, як беларус, не возьмецца сам за справу свайго жыцця, дык яму ад расійцаў чакаць няма чаго.

3) Тое, што сярод камуністаў, якія працавалі ў Беларусі ў першыя часы рэвалюцыі, было вельмі мала мясцовых элементаў, і гэта давала магчымасць нацыяналістычным элементам абараняць сваю нацыянал-дэмакратычную платформу, кажучы, што за бальшавікамі ісці няма чаго, бо яны чужынцы на Беларусі, не ведаюць жыцця, патрэб і г.д. беларускага насельніцтва і таму не могуць правільна кіраваць далейшым развіццём жыцця Беларусі.

Значнага ўплыву Беларускі Нацыянальны Камітэт не меў. Але ён рушыў збіранне нацыяналістычных сіл. Па ўсёй Беларусі, а таксама ў Расіі сярод беларускіх уцекачоў пачалі арганізоўвацца гурткі, партыі ды арганізацыі, якія так ці іначай хацелі прыняць удзел у палітычным жыцці Беларусі.

Аднаўленне старых дэмакратычных беларускіх арганізацый выклікала пэўную дэмакратызацыю беларускага цэнтра. Рада беларускіх арганізацый, абраная ўлетку 1917 года, выключыла з свайго складу абшарнікаў, ксяндзоў і склалася пераважна з сяброў Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

Дэмакратызаваная Рада беларускіх арганізацый зрабілася больш небяспечнай для пралетарскай рэвалюцыі. Рада імкнулася сваю платформу будаваць так, каб падладзіцца пад рэвалюцый-

ныя настроі сялянства. Самы склад яе быў больш дэмакратычны. Хаця па сутнасці Рада не ішла далей нацыянал-дэмакратычнае праграмы, але з надворнага боку яна мела рэвалюцыйны выгляд. Гэта дало ёй магчымасць павесці працу па заваяванні інтэлігенцыі і сялянства. Работа пайшла, у першую чаргу, сярод вайсковых беларусаў. Адбыліся з'езды Заходняга, Паўднёвага, Паўночна-Заходняга, Румынскага фронту. На гэтых з'ездах Рада і Беларуская Сацыялістычная Грамада адыгрывалі першую ролю. Абіраліся Вайсковыя Рады. Рэзалюцыі гэтых з'ездаў складваліся так, каб, з аднаго боку, задаволіць рэвалюцыйныя настроі ды імкненні салдат (сялян), а з другога боку, каб правесці пункты аб падтрыманні і ўзмацненні палітычнага стану Рады.

Такім чынам, побач з паступовым збіраннем сіл, каля бальшавікоў і Савета Беларусі дзеля захаплення ўлады беларускімі рабочымі і сялянамі ішла зусім самастойна праца беларускіх нацыяналістычных арганізацый, якія імкнуліся збіраць вакол сябе сілы пераважна сялянства і сялянскае інтэлігенцыі, каб накіраваць іх супраць Саветаў, супраць Сацыялістычнае рэвалюцыі.

Галоўным пунктам барацьбы між рэвалюцыйнымі і супрацьрэвалюцыйнымі сіламі Беларусі за далейшыя шляхі рэвалюцыі было нацыянальнае пытанне.

Замест усіх пытанняў сацыяльнай рэвалюцыі, у тым ліку і нацыянальнага, як гэта робіць Кампартыя, на першы план высоўвалася нацыянальнае пытанне як зусім самастойнае, як тое пытанне, вырашэнне якога павінна стаяць наперадзе вырашэння ўсіх іншых пытанняў рэвалюцыі. Такая тактыка была тым больш лёгкай, што сацыяльныя і нацыянальныя ўзаемаадносіны ў Беларусі былі надзвычайна заблытаныя.

Нацыянальны склад жыхароў Сав. Беларусі ў прац. такі:

Вясковага насельніцтва:

Беларусаў — 75,90, рускіх — 16,20, палякаў — 2,05, яўрэяў — 5,24, інш. — 0,61.

Гарадскога:

Беларусаў — 40,74, рускіх — 10,65, палякаў — 2,46, яўрэяў — 44,14, інш. — 2,01.

Усяго:

Беларусаў — 70,79, рускіх — 15,41, палякаў — 2,10, яўрэяў — 10,88, інш. — 0,32.

Цяжка высветліць сучасны нацыянальны склад Заходняй Беларусі, бо польская ўрадавая статыстыка імкнецца да таго, каб давесці, што на Крэсах ёсць польская большасць. Але думаецца, што мы зробім невялікую памылку, калі пасля параўнання ўсіх лічбаў скажам, што нацыянальны склад Заходняй Беларусі такі:

Беларусаў — 64 прац., палякаў — 16 прац., яўрэяў — 12 прац., іншых — 8, беларускае насельніцтва з'яўлясцца пераважна сялянскім, а ў гарадах большасць складаюць яўрэі.

Нягледзячы на гэта, у царскія часы пануючае становішча ў Беларусі займалі расійцы ды палякі, першыя ў якасці прадстаўнікоў адміністрацыі, а другія як найбольш буйныя землеўласнікі.

З усяго гэтага відаць, што нацыянальнае пытанне ў Беларусі ўвесь час стаяла вельмі востра. Сацыяльныя супярэчнасці паміж класамі пераблытваліся з нацыянальнымі, і наадварот. Важнейшая перашкода па аб'яднанні рабочых і сялян для рэвалюцыйнай барацьбы ўвесь час была з боку вельмі заблытаных нацыянальных узаемаадносін.

Зразумелая рэч, што супрацьрэвалюцыйныя цэнтры імкнуліся выкарыстаць нацыянальнае пытанне ў сваёй барацьбе за тое, каб прыпыніць пераход Лютаўскай рэвалюцыі, рэвалюцыі буржуазна-дэмакратычнай у рэвалюцыю Кастрычніцкую — пралетаскую, сацыялістычную.

Кастрычніцкая рэвалюцыя прыспешыла канчатковае афармленне палітычных платформ. Супраць Камуністычнае партыі і Саветаў рашуча выступілі, паклаўшы ў аснову сваёй барацьбы нацыянальнае пытанне, два цэнтры: «Беларускі і Абласны Камітэт» як ідэйны кіраўнік і арганізацыйна-палітычны цэнтр расійскай і зрусіфікаванай буржуазіі, дробнабуржуазных, мяшчанскіх, інтэлігенцкіх і сацыял-згодніцкіх зрусіфікаваных элементаў з дамаганнем Краявой (абласной) аўтаноміі і «Беларуская Рада», «Беларускі Нацыянальны Камітэт» ды іншыя блізкія да іх арганізацыі як ідэйныя кіраўнікі і арганізацыйна-палітычныя цэнтры нацыянальных дэмакратычных беларускіх элементаў з праграмай «дэмакратычнай дзяржаўнай незалежнасці Беларусі».

Беларускі Абласны Камітэт арганізаваўся ў 1917 годзе з сяброў 1-га Усерасійскага З'езду сялянскіх дэпутатаў у Ленінградзе. Ён стаяў на грунце дэмакратычнага, гэта значыць буржуазнага, парадку. Ён ні ў якім разе не дапускаў аддзялення Беларусі ад дэмакратычнай жа, гэта значыць буржуазнай, Расіі. Ён не верыў у магчымасць будавання сацыялізму.

Ён пакідаў без змены сацыяльныя, маёмасныя ўзаемаадносіны. Калі «Камітэт» і гаварыў аб перадачы без выкупу зямлі сялянам і, такім чынам, нібы станавіўся на рэвалюцыйны грунт, дык гэта быў толькі агітацыйны сродак: канчатковае вырашэнне зямельнага пытання, як і ўсіх іншых пытанняў, «Камітэт» адкладаў да Усерасійскага Устаноўчага Збору, які павінен быў быць абраны шляхам агульнага, роўнага, тайнага і простага галасавання, значыць з удзелам буржуазіі. Камітэт

нічога не гаварыў аб прамыслоўцах, банкірах, іх ён не чапаў. Але ў той жа час ён не мог не зачапіць прамыслоўцаў, банкіраў і г.д., раздаўшы без выкупу зямлю сялянам, бо ўся абшарніцкая зямля была ў закладзе ў банках, лясы прададзены прамыслоўцам, воды аддадзены ў арэнду і г.д. Нияк не сыходзяцца канцы з канцамі.

Агульнанацыянальнай справай «Камітэт» лічыў «спасенне» Беларусі ад Кастрычніцкай рэвалюцыі. Буржуазна-дэмакратычныя сілы, настроі да імкненні якіх адбіваў «Камітэт», бачылі, што буржуазная Расія разваліліся, і таму, прыкрыўшыся агульнанацыянальнай справай, яны паставілі пытанне аб тым, каб самім заняць пануючы стан у Беларусі замест страціўшай панаванне расійскай буржуазіі.

«Цяпер надышоў момант», кажа «Камітэт» у сваёй дэкларацыі, «калі Беларусь, як цэлая вобласць у асобе свайго працоўнага сялянства, павінна сказаць сваё слова. Але не дзеля таго, каб зрабіць Расіі новы боль ці ўнесці ў яе разруху новую палку, а дзеля таго, каб сваёй арганізаванай сілай памагчы сабе самой і ў той жа час падтрымаць сілы многапакутнай Расіі».

«Мы звярачаемся», кажа далей дэкларацыя, «да працоўнага беларускага сялянства, да земскіх і гарадскіх самаўрадаў Беларусі, кааператываў, да саветаў сялянскіх дэпутатаў, да ўсіх беларусаў-вайсковых, да беларускай сялянскай інтэлігенцыі ў асобе настаўнікаў і да ўсяго насельніцтва нашае бацькаўшчыны»...

Не да рэвалюцыі клікаў «Камітэт», а супраць рэвалюцыі.

«Камітэт» стварыўся не дзеля дапамогі расійскім рабочым ды сялянам у іхняй барацьбе супраць буржуазіі, але дзеля таго, каб пайсці супраць Кастрычніцкай рэвалюцыі на дапамогу многапакутнай Расіі — Расіі паноў, капіталістаў, абшарнікаў. Таму і сілы, на якія хацеў абаперціся «Камітэт», былі варожыя Кастрычніцкай рэвалюцыі. «Камітэт» хацеў шырокім каркам сялянства закрыць свой сапраўдны буржуазны твар, ён высоўваў наперад сялянства, сялянскія саветы, сялянскую інтэлігенцыю і гэтым прыкрываў контррэвалюцыйныя земствы, гарадскія самаўрады і *ўсё насельніцтва Беларусі* — гэта значыць і буржуазію.

«Камітэт» заклікаў да аб'яднання «ўсіх сіл» для барацьбы за «автономно-свободную Белоруссию как часть Российско-Федеративной Республики», ён высоўваў барацьбу за «аўтаномію» замест барацьбы за сацыяльныя інтарэсы рабочых і сялян, ён *хацеў нацыянальнае пытанне* выкарыстаць для барацьбы супраць рэвалюцыі.

«Беларускі нацыянальны Камітэт» быў абраны 25 сакавіка 1917 года на з'ездзе беларускіх арганізацый у Менску. Ён

выкінуў лозунг нацыянальна-культурнай аўтаноміі. «Асноўны, прынцыповы грэх гэтай праграмы», кажа тав. У.І. Ленін, «той, што яна імкнецца правесці ў жыццё самы ўдасканалены і самы абсалютны, да канца давездены, нацыяналізм. Сэнс гэтае праграмы: кожны грамадзянін запісваецца ў якую-колечы нацыю і кожная нацыя складае юрыдычнае цэлае з правам прымусовага ападаткавання сваіх сяброў, з нацыянальнымі парламентамі (соймамі), з нацыянальнымі статс-сакратарамі (Міністрамі)».

Беларускія нацыянал-дэмакратычныя сілы шукалі ў той час магчымасці забяспечыць сабе панаванне ў Беларусі пакуль што ў межах «дэмакратычнай» Расіі. Абмяжоўваючы свае патрабаванні дамаганнем нацыянальна-культурнай аўтаноміі, яны імкнуліся стварыць агульна нацыянальны беларускі фронт, замацаваць праз гэта сваю кіруючую ролю, каб потым ужо больш выразна паставіць пытанне аб «суверэнных правах» беларускага народа, гэта значыць аб правах нацыянальнай буржуазіі на панаванне над народам. І мы бачым, як нацыяналістычная буржазія і нацыянал-дэмакратычная інтэлігенцыя Беларусі ў 1918 г. абвясцілі Беларускую Народную Рэспубліку і клікалі да стварэння адзінага нацыянальнага фронту, або да стварэння «адной вялікай партыі з усіх беларусаў» для барацьбы за «дэмакратычную незалежнасць» Беларусі. Галоўнай мэтой, такім чынам, ставілася стварэнне «сваёй незалежнай, нацыянальнай дзяржавы», усе іншыя пытанні павінны былі служыць гэтай галоўнай мэце. Аб'яднанне ўсіх беларускіх сіл незалежна ад іх сацыяльнай, класавай прыналежнасці дзеля імкненняў да барацьбы за незалежнасць — вось што праводзілася ў шырокія масы рабочых і сялян. Сацыяльнаму руху проціставіўся рух нацыянальны. Гаварылася пра тое, што ўсе сацыяльныя пытанні Беларусі здолеюць быць правільна і без перашкоды вырашаны ў адпаведнасці з патрэбамі ўсяго насельніцтва толькі ў тым выпадку, калі Беларусь арганізуецца, як самастойная дзяржаўная адзінка. Беларускія буржуазна-дэмакратычныя элементы імкнуліся пры дапамозе рабочых і сялян (бо супраць расійскага і польскага імперыялізму яны хацелі арганізаваць беларускія палкі з рабочых ды сялян) замяніць сабою расійскую буржуазію, хацелі сэнс нацыянальнага пытання, правы нацый на самавызначэнне абмежаваць сваім правам, заняць пануючае месца ў Беларускай «сваёй» нацыянальнай дзяржаве.

Такім чынам, дамаганне і аўтаноміі, і незалежнасці мае імкненне аддзяліць нацыянальны рух ад сацыяльнага і забяспечыць рукамі ўцягваемых у нацыянальную барацьбу рабочых і сялян камандуючае становішча нацыянальнай або краёвай буйной і дробнай буржуазіі. Розніца толькі ў тым, што імкненне да

аўтаноміі закрывае сабой барацьбу краёвай буржуазіі за параўнанне праў у мясцовых справах краёвай буржуазіі з агульна-імперскай, а імкненне да незалежнасці хавае барацьбу нацыянальнай буржуазіі за пануючае становішча яе — нацыянальнай буржуазіі — у мясцовых «нацыянальных» справах.

Агульным для разумення нацыянальнага пытання з аднаго і другога боку з'яўляецца імкненне аддзяліць, адмежаваць і закрыць агульнанацыянальным фронтам сацыяльныя пытанні, сацыялістычную рэвалюцыю, перавесці на шлях буржуазна-дэмакратычнай.

Такое разуменне нацыянальнага пытання адбівае класавыя інтарэсы, настроі ды імкненні буржуазных, капіталістычных элементаў горада і вёскі і знаходзіцца ў супярэчнасці з тымі сіламі, якія забяспечылі перамогу Лютаўскай рэвалюцыі і пераход буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі да сацыялістычнай.

Галоўныя сілы Лютаўскай рэвалюцыі — рабочыя і сяляне, і таму зразумела, што буржуазія, высоўваючы наперад нацыянальнае пытанне, манілася гэтым закрыць тыя галоўныя пытанні, у імя якіх рабочыя ды сяляне прымалі ўдзел у рэвалюцыі і без вырашэння якіх немагчыма вырашэнне нацыянальнага пытання.

Лік рабочых у Беларусі нязначны. Па сваім нацыянальным складзе гэта — беларусы, яўрэі, палякі, латышы, рускія ды інш. Для кожнай з гэтых груп рабочых агульны эканамічны ўціск ды эксплуатацыя з боку капіталістаў пагаршаўся яшчэ і нацыянальнай бяспраўнасцю. *Значыць, для ўсіх рабочых Беларусі востра стала і нацыянальнае пытанне як частка агульных пытанняў сацыяльнай класавай барацьбы.* Сацыял-згодніцкія партыі, якія карысталіся некаторым уплывам сярод рабочых, самі ў большасці стаялі на нацыяналістычным грунце і клікалі за сабой рабочых. Сярод гэтых партый асабліва значным уплывам карыстаўся «Бунд». Рабочаму даводзілася самому класавым пачуццём шукаць і знаходзіць правільную дарогу. Гэту правільную дарогу паказвае ўвесь час рабочаму яго правадыр — Камуністычная партыя, якая кажа, што не супольныя з буржуазіяй, нацыянальныя, але супольныя для рабочых усіх нацыянальнасцей класавыя інтарэсы, барацьба за гэтыя класавыя інтарэсы здолеюць знішчыць і эканамічнае, і нацыянальнае прыгнечанне.

Другая сіла рэвалюцыі — гэта сялянства. Звыш 75 прац. сялянства Беларусі — беларусы.

Да рэвалюцыі сярод беларускага сялянства вызначаўся досыць значны падзел на багатых, сярэдніх і бедных (дыферэнцыя). Нягледзячы на гэта, перад рэвалюцыяй усё беларускае сялянства мела шэраг супольных інтарэсаў, якія

супярэчылі інтарэсам абшарнікаў, паноў ды царскай адміністрацыі.

Усе сяляне хацелі прыдбаць сабе больш зямлі за лік абшарніцкіх маёнткаў.

Усе сяляне хацелі скасаваць сэрвітут на сваю карысць.

Усе сяляне хацелі паменшыць або зусім скасаваць падаткі, арэнду.

Усе сяляне імкнуліся знішчыць сляды прыгону, якія ўвесь час яшчэ былі знаць і абмяжоўвалі правы сялянства ў грамадскім і палітычным жыцці.

Нарэшце, усе сяляне адчувалі страшэнныя здзекі над сваёй мовай, сваёй культурай, сваім жыццём. Значыць, перад рэвалюцыяй усё сялянства мела супольныя інтарэсы ў барацьбе супраць буржуазіі, супраць царызму.

Барацьба гэта мела сацыяльную падставу, але адначасна яна была і нацыянальнай барацьбой, бо была барацьбой беларускага сялянства супраць польскага, расійскага ды іншага абшарніка, урадаўца, капіталіста.

Польскае, літоўскае, латышскае сялянства Беларусі знаходзілася ў аднолькавых умовах з беларускім сялянствам і таму займала аднолькавае з ім становішча ў рэвалюцыі.

Расійскае сялянства Беларусі, хаця яго царызм і клікаў на барацьбу за Расію, супраць «бунтаўшчыкоў», не магло ісці з царызмам, бо яно знаходзілася ў такім жа самым цяжкім матэрыяльным стане, як і ўсе іншае сялянства.

Папярэдні перыяд рэвалюцыйнай барацьбы паставіў сялянства ў барацьбе супраць буржуазіі побач з рабочым, рабочы стаў арганізатарам і кіраўніком сялянскага руху.

Вось чаму Лютаўская рэвалюцыя была рэвалюцыяй рабочых і сялянства супраць царызму і супраць абшарнікаў.

У Лютаўскую рэвалюцыю сэнс нацыянальнага пытання ў Беларусі ў першую чаргу быў у тым, каб знішчыць эканамічнае, палітычнае і нацыянальнае прыгнечанне рабочага, каб вызваліць селяніна ад абшарніка, каб зрабіць селяніна «чалавекам», бо сяляне захацелі ўжо «людзьмі звацца».

Але правільна кажа тав. Сталін: «Нацыянальнае пытанне не ёсць нешта такое, што само праз сябе вызначаецца і само для сябе існуе ў формах, раз назаўсёды даных. З'яўляючыся толькі часткай агульнага пытання аб перамене таго ладу, які існуе ў даны момант, нацыянальнае пытанне цалкам вызначаецца ўмовамі сацыяльных адносін, характарам улады ў краіне і наогул усім поступам грамадскага развіцця».

Таму і сэнс нацыянальнага пытання ў Беларусі паступова, з развіццём рэвалюцыі, пачаў змяняцца, як пачалі змяняцца адносіны да рэвалюцыі розных сацыяльных груп.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы